І-б. "Савецкая Беларусь" Москва, Моховая, 3 Публичная библиотека СССР им. Ленина отд. обмен. адвін экз.

Пралетарыі ўсіх краёў, аднаўчайцеся!

Łaczcie się! соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПЯТНІЦА
27 лістапада 1931 г.
№ 273 (3362)

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў—цэнтральная задача

У незамірнай барацьбе за генэральную лінію партыі супроць галоўнай небясьпекі на даным этапе—правага апартунізму, агентуры кулацтва, і «левых» загібаў, на аснове пасьпяховага вырашэньня задачы індустрыялізацыі краіны, КП(б)Б дабілася выключных перамог у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, у галіне ажыцьцяўленьня палітыкі суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як клясы.

Да 1-га лістапада бягучага году калгасамі аб'яднана 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР, прычым найбольшы процант калектывізацыі мы маем у раёнах дзейнасьці МТС (57,4) і ў лёнаводчых раёнах (57,2) 9 раёнаў у асноўным ужо завяршылі суцэльную калектывізацыю.

Нашы буйнейшыя посьпехі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі забясьпечылі значнае пашырэньне пасеўных плошчаў, у прыватнасьці пасеўных плошчаў пад тэхнічнымі культурамі (так, плошча пад лёнам за адзін год вырасла з 140 да 230 тыс га), падвышэньне ўраджайнасьці і таварнасьці сельскае гаспадаркі.

Калгасы БССР ужо на сёньнешнім этапе свайго разьвіцьця паказваюць цэлы рад буйнейшых пераваг калектыўнай гаспадаркі над аднаасобнай. У публікуемай сёньня ў нашай газэце пастанове аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б «аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў» падаец ца рад выключна яркіх лічбаў. Так, яравых пасеваў на калгасную сям'ю прыпадае 4,04 га, тады як на сям'ю аднаасобнай гаспадаркі—толькі 2,43 га; на адну цягавую адзінку ў калгасах—4,5 га, у аднаасобнікаў—2,3 га; пасеву тэхкультур на адну калгасную сям'ю—0,4 га супроць 0,2 га на сям'ю аднаасобнае гаспадаркі.

Усе гэтыя факты лішні раз пацьвярджаюць абсалютную правільнасьць той характарыстыкі чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), згодна якой калгаснае сялянства стала цэнтральнай фігурай земляробства, асноўным і галоўным вытворцай ня толькі збожжа, але і важнейшай сельска-гаспадарчай сыравіны. Рост саўгасаў і калгасаў вызначыў тую буйнейшую нашу перамогу, у выніку якой мы канчаткова вырашылі збожжавую праблему, у асноўным вырашылі праблему сельска-гаспадарчай тэхнічнай сыравіны і ва ўвесь рост змаглі паставіць праблему жывёлагадоўлі як цэнтральную праблему на даным этапе.

Выключнае значэньне маюць і тыя сацыяльна-клясавыя зрухі ў краіне, якія зьяўляюцца вынікам калектывізацыі паловы сялянскіх гаспадарак БССР. Уступленьне ў калгасы 50 проц бядняцка серадняцкіх гаспадарак БССР азначае, што большасьць бядняцка-серадняцкіх мас вёскі БССР зрабіла рашучы паварот у бок сацыялізму. Гэта няўхільна зьмяніла і суадносіны клясавых сіл у вёсцы. Вытворчая база кулацтва падарвана скрозь і ўсюды, а ў тых 9-ці раёнах, у якіх у асноўным завяршана суцэльная калектывізацыя, яна (вытворчая база кулацтва) зьнішчана. Сацыялістычны спосаб вытворчасьці, сацыялістычныя вытворчыя адносіны занялі пераважнае месца ня толькі ў прамысловасьці, але і ў сельскай гаспадарцы.

Таму наша цэнтральная задача заключаецца зараз ў тым, каб сацыялістычныя перамогі ў сельска-гаспадарчым сэктары нашай эканомікі былі замацаваны. Нельга ўпускаць з-пад увагі таго, што «дасягнутыя посьпехі ў арганізацыі калгаснай вытворчасьці зьяўляюцца толькі яшчэ першапачатковымі, не выкарыстоўваюцца яшчэ тыя магчымасьці разьвіцьця высокатаварнай гаспадаркі, якія забясьпечваюцца буйнай калектыўнай гаспадаркай, умовамі савецкага ладу і той вялізарнай вытворчай дапамогай, якая аказваецца калгасам з боку пралетарскай дзяржавы». (З пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Мы маем усё яшчэ нізкі выхад таварнай прадукцыі, нізкую ўраджайнасьць, нізкую ўдойлівасьць, вусім нізкі процант выхаду таварных сьвіней, значнае асяданьне таварнай прадукцыі ў саміх калгасах, шырока распаўсюджаныя спажывецкія настроі, выпадкі рвацтва і г. д. Яшчэ надзвычайна дрэнна арганізавана праца і на нізкім узроўні знаходзіцца працоўная дысцыпліна ў калгасах.

Гэтым і тлумачыцца тое, што задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, зьяўляецца цэнтральнай задачай калгаснага будаўніцтва на даным этапе. Трэба зразумець, што зараз, на аснове ўжо дасягнутых посьпехаў у галіне калектывізацыі, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў прадрашае пераход у калгасы астатняй масы беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў. Іменна на аснове і ў выніку нашых посьпехаў у барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў будзе ісьці далейшы рост калектывізацыі, далейшае ўцягненьне сялянства ў калгасы.

Таму сугуба шкодная зьяўляецца «пагоня за разлутымі лічбамі калектывізацыі», «левацкае» супрацьпастаўленьне задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў задачам барацьбы за суцэльную калектывізацыю.

У рашучай і бязьлітаснай барацьбе з праваапартуністычнай стаўкай на самацёк у калгасным будаўніцтве і з «лезацкай» пагоняй за разлутымі лічбамі калектывізацыі, на аснове шырока разгорнутай работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў будзе вырашана задача суцэльнай калектывізацыі.

«Хто падмяняе гэтую асноўную задачу пагоняй за дутымі процантамі калектывізацыі, той ня толькі не разумее асноўных задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на даным этапе, але ідзе супроць лініі партыі». (З пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

У гэтай сувязі і ў поўнай адпаведнасьці з рашэньнямі ЦК УсеКП(б) лістападаўскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б адмяніў пастанову лістапеньскага пленуму ЦК КП(б)Б у той частцы, якая ставіць перад партыяй задачу дабіцца вясной 1932 году ахопу 75 проц. сялянскіх гаспадарак і суцэльнай калектывізацыі да канца 1932 году і зацьвердзіў пастанову Бюро ЦК ад 10 лістапада аб артыкуле ў «Правде» ад 28 верасьня.

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў ёсьць важнейшы шлях замацаваньня колькасных посьпехаў калектывізацыі, ёсьць тое звяно агульнага ланцугу, за якое неабходна зараз ухапіцца, каб забясьпечыць далейшы ўзлым калектывізацыі.

Галоўнай рашаючай задачай зьяўляецца барацьба за высокую прадукцыйнасьць працы. Ленін вучыў нас, што «капіталізм можа быць канчаткова пераможан і будзе канчаткова пераможан тым, што сацыялізм створыць новую, значна больш высокую прадукцыйнасьць працы». Вось за гэту «новую, значна больш высокую прадукцыйнасьць працы» кожнага калгасьніка і трэба настойліва і ўпарта змагацца. Гэту задачу ня вырашыць без барацьбы за перавыхаваньне мас калгаснага сялянства, за выкарчоўваньне дробна-буржуазных перажыткаў і настрояў, за выкарчоўваньне дробна-буржуазнай стыхіі. Стварыць «новую значна больш высокую прадукцыйнасьць працы» ў калгасным сэктары можна толькі на аснове рашучага ўнядрэньня зьдзельшчыны, арганізацыі чоткага ўліку працы кожнага калгасьніка, прарільнага разьмеркаваньня калгасных даходаў і ўраджаяў па якасьці і колькасьці працы, ліквідацыі дробна-буржуазнай уравнілаўкі і абязьлічкі. Стварыць высокую прадукцыйнасьць працы ў калгасным сэктары, гэта значыць змагацца за высокую ўраджайнасьць, за высокую ўдойлівасьць, за зьнішчэньне, за зьвядзеньне да мінімуму адходу маладняка ў жывёлагадоўчых калгасах, за большы выхад таварнай прадукцыі. Стварыць новую высокую прадукцыйнасьць працы гэта значыць змагацца супроць кулацкіх, буржуазных тэндэнцый, супроць рвацтва, супроць спробаў супрацьставіць інтарэсы пралетарскай дзяржавы інтарэсам калгасаў і калгасьнікаў.

Пастанова лістападаўскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б дае разгорнутую праграму шырокай барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ўзлым на новую ступень калгаснай вытворчасьці, за завяршэньне суцэльнай калектывізацыі.

Трэба разгарнуць шырачэзную, энэргічнейшую работу па ажыцьцяўленьні бальшавіцкай праграмы барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Трэба ўзьняць на вырашэньне гэтай задачы ўсю КП(б)Б. Трэба рашэньне пленуму ЦК і ЦКК зрабіць здабыткам усяго калгаснага сялянства і шырокіх мас бядняцка-серадняцкага сялянства.

Сусьветная банда імпэрыялістаў разьдзьмухвае пажар вайны ў Манчжурыі

Далейшае выкрыцьцё правакацыі японскага імпэрыялізму

Узбройвала кітайскіх генэралаў сама Японія

БЭЙПІН, 24.XI. У сувязі з паведамленьнем ад 21 лістапада аб выкрыцьці выпадкаў продажу японскай канторай зброі кітайскім генэралам, вялізарны інтарэс выклікае наступнае паведамленьне, якое зьмешчана японскай газэтай «Макасі-ніппо», што выдаецца ў Дайрэне пад сэнсацыйным загалоўкам: «Міжнародная зграя контрабандыстаў па продажы зброі ў Паўночную Манчжурыю» і «Арышт чыноўнікаў Дайрэнскай мытніцы і служачых вялікай канторы».

Газэта піша: «Дайрэнскай паліцыяй арыштавана 2 чыноўнікі дайрэнскай мытніцы і некалькі служачых вялікай канторы. Гэтая зграя ўтварала апэрацыі па продажы зброі праз Харбін-Хэйлуцзян (Цыцыкар). Зграя гэта, скарыстаўшы міжнародныя падзеі, забясьпечвала праз Дайрэн-Харбін зброяй кітайскіх генэралаў і хунхузаў Паўночнай Манчжурыі. Работа гэтай зграі была настолькі добра арганізавана, што да самага апошняга часу яны ня былі выкрыты. Ня гледзячы на ўзмоцненую ахову, гэтая зграя перавозіла зброю і патроны амаль адкрыта. Мяркуецца, што чыноўнікі знаходзяцца па ўсёй Манчжурыі».

Заўвага: Паказаная ў газэце «нейкая вялікая кантора» зьяўляецца буйнейшай японскай транспартна-суднавай канторай «Кокусай-ульдю». Гэта кантора падпарадкавана Паўднёва-Манчжурскай чыгунцы і зьяўляецца арганізацыяй кіруемай японскай уладаю ў Манчжурыі.

**

ШАНХАЙ, 21.XI. Паводле паведамленьня агенцтва «Гоміль», японскае вайсковае судно, умяшчальнасьцю 10.000 тон, прыйшло ў Цыньдао (порт у правінцыі Хобэй) нібыта для абароны радыёстанцыі.

Клубок правакатарскай дзейнасьці раскручваецца

У Сіньміні пастаўшчыкоў зброі кітайскім генэралам уцягнуты вялікія тузы сусьветнага імпэрыялізму

БЭЙПІН, 26. Японская прэса ў Дайрэне працягвае зьвяртаць увагу на скандальнае выкрыцьцё фактаў забесьпячэньня японцамі зброяй цыцыкарскіх войск. Японская газэта Дайрэн Сімбун з 28 лістапада паведамляе: «у выніку дазнаньня аб кантрабандзе дастаўцы зброі цыцыкарскім войскам устаноўлен удзел апрача ары штаваных 10 чалавек японцаў, таксама амэрыканцаў і больш 50 чалавек расійцаў (гутарка ідзе аб белагвардзейцах) Правадыр з японскага боку Тацікума атрымлівае грашовую дапамогу ад адной буйной кампаніі ў Дайрэне. Дапушчаюць, што прадстаўнікі адзначанай буйной кампаніі будуць арыштаваны».

Газэта Мансюн Нінко ад таго самага чысла зьмяшчае наступнае паведамленьне: «у выніку паказаньня двайх расійцаў узмоцніліся арышты Арыштавана яшчэ 8 інастранцаў розных нацыянальнасьцяй і 4 японцы. Мяркуецца, што за сьпіной японскага правадыра хаваецца вядомы фінансіст. Справа набывае скандальны абарот. Могуць аказацца ўцягнутымі сфэры, думка аб удзеле якіх не дапушчалася».

Яп нскае вой ка наст па на Кешань

БЭЙПІН, 20-XI. Паводле паведамленьня газэт, японская армія на поўначы Манчжурыі прасоўваецца да Кешані з мэтаю захопу ўсёй Цыцыкар-Кешанскай чыгункі.

Паводле гэтых-жа паведамленьняў, генэрал Ма сканцэнтроўвае вайсковыя сілы ў Кешані і чакае падмацаваньняў для контр-атакі.

Баі ў раёне Таян

ТОКІЕ, 25-XI. Японскае агенцтва «Сімбун Рэнго» з Муклэну паведамляе, што цзіньчжоўскае войска (войска Чжан-Сюэ-ляна) нібыта працягвае адпраўляць атрады на ўсход. З гэтай-жа крыніцы паведамляюць, што баі ў раёне Таян (на рэчцы Ляо, на паўшляху паміж Паўднёва-Манчжурскай і Вэйбін-Муклэнскай чыгункамі) закончыліся адступленьнем кітайскіх атрадаў.

**

ТОКІЕ, 25-XI. Вайсковы міністр Мінамі пераляў Вакацукі (прэм'ер-міністр), што баі ў раёне Таян (на рэчцы Ляо) ні ў якім разе нельга лічыць «ваеннымі дзеяньнямі» і што яны зьяўляюцца «мерапрыемствамі палітычнага паралку».

Паводобныя экспэдыцыі будуць пасылацца і надалей,—заявіў Мінамі. Адзнак, іх ня трэба разглядаць як падрыхтоўку да сутычкі з цзіньчжоўскім войскам.

Новыя японскія часьці „для падтрыманьня парадку"

МУКДЭН, 26. Штаб генэрала Хондзіо (начальнік японскай аккупацыйнай армії) паведамляе, што пасьля баёў у Сіньміне паліцыя ўцякала ў панцы і насяленьне засталося ў «вялікім непакоі». У сувязі з гэтым сёньня з Муклэна ў Сіньмінь адпраўлены японскія падмацаваньні для падтрыманьня «міру і парадку».

**

ТОКІЕ, 26. Паводле паведамленьня Сімбун Рэнго з Цзяньсіна японскі консул прапанаваў рэзыдэнтам Цзіньдао і Шанхайгуана эвакуявацца ў Цьзянь цзінь з прычыны «напружанага становішча».

Лаўкасьць рук... або інтэрв'ю ген. Хондзіо

Да заявы т. Літвінава

Пасьля заявы т. Літвінава

Японскія заказы на зброю ў Англіі

ЛЕНДАН, 25 У палаце абшчын лібэрал Мендэр запытаўся ў Макданальда, ці верае ён, што Японія разьмясьціла ў Англіі заказы на маторы для гідраплянаў і ці не абмяркуе ён пытаньне аб пажаданасьці пры сучасных умовах забараніць вываз тавараў шляхам мерапрыемстваў міжнароднага характару. Макданальд адказаў, што ён ня можа прыняць прапановы Мендэра.

„Патрыятычны" гэст гам нданаўскай клікі

ШАНХАЙ, 25-XI. Нанкінскі урад прапанаваў Шы перадаць савету Лігі контр-прапанову, выстаўляючы наступныя пункты:

1. Ліга нацый павінна неадкладна ўжыць энэргічныя меры, з мэтаю спыненьня наступальнай дзейнасьці японскага войска.

2 З моманту прыняцьця новай прапановы, японскае войска не пазьней чым у 2-тыднёвы тэрмін павінна быць цалкам эвакуявана ў раён Паўднёва-Манчжурскай чыгункі.

Інструкцыя прапануе зьвярнуць увагу Лігі нацый на тое, што калі рэзалюцыі прынятыя на папярэдніх пасяджэньнях Лігі, будуць як і раней ігнаравацца, калі Ліга нацый будзе працягваць настойваць на арганізацыі нэйтральнай камісіі, арганізацыя якой несумяшчальна з прынцыпамі, выкладзенымі ў ранейшых рашэньнях, і калі японскае войска будзе працягваць агрэсыўныя дзейньні,—дык кітайскі урад будзе змушаны ўжыць неабходныя меры абароны.

Арганізацыя белых банд для нападу на Трыторыю СССР

Бандыт Вушакоў раскрывае пляны японскіх імпэрыялістаў

БЭЙПІН, 25-XI. Як паведамляюць з Харбіну, паводле газэтных вестак, арыштаваны пихаўна кітайскай уладай на ст. Манчжурыя белагвардзеец Вушакоў, у якога выяўлены дакументы Харбінскай вайсковай місіі, адпраўлены ў Хайлар, дзе штабам кітайскага войска вядзецца сьледзтва.

Газэта зазначае, што допыт высьвятліў, што японцы абавязаліся забясьпечыць зброяй актыўную белую арганізацыю для стварэньня беспаралкаў у Паўночнай Манчжурыі і для арганізацыі налётаў па савецкую тэрыторыю, з мэтаю наскоку ў галіну ракі Амура. Арганізацыю ўзначальваюць 8 белагвардзейцаў, якія працуюць пад кіраўніцтвам японцаў.

На ўсебеларускім зьезьдзе калгасьніц

Першы ўсебеларускі

25 лістапада ў горадзе Менску (у клюбе карчавікоў) а 7 гадз увечары адкрыўся першы Ўсебеларускі зьезд жанчын-калгасьніц.

Да моманту адкрыцьця зьезду прыбыло 350 дэлегатаў з розных калгасаў і раёнаў БССР

З вялікай уступнай прамовай адкрыў зьезд старшыня Белкалгасцэнтру тав Міцькоў.

Пад гучныя воплескі і гукі аркестру аднагалосна абіраецца прэзыдыум зьезду, у склад якога ўваходзяць тт. Гей, Шаранговіч, Чарвякоў, Галадзед; Рачыцкі, Міцькоў; Палякоў; Масюкова (калгасьніца Клімавіцкага раёну) Сімка Мільда (калгас «Райтэрштэрн», Лёзьнянскі раён) Давыдоўская (калгас «Камбайн» Слуцкага раёну), Сусава (калгас «Камінтэрн» Магілеўскага раёну) і інш.

У ганаровы прэзыдыум абіраюцца тт. Сталін, Молатаў, Варашылаў, Калінін, Якаўлеў і Крупская.

Зьезд віталі дэлегацыі жанчын ударніц г. Менску, якія выканалі пяцігодку ў тры гады.

— Першаму зьезду жанчын калгасьніц, барацьбітом за сацыялістычную перабудову вёскі шчырае бальшавіцкае прывітаньне,—з трыбуны зьезду вітае работніца фабрыкі «Кастрычнік».

Работніцы прадпрыемстваў расказалі «сакрэт» сваіх перамог, перадалі вопыт работы і пажадалі з такімі-ж посьпехамі дабіцца перамог кожнаму калгасу.

Ад рабочых заводаў «Бальшавік» і імя Варашылава зьезд віталі з рапартам аб перамогах дэлегаты лепшых рабочых-ударнікаў.

Зьезд паслаў прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б, СНК і ЦВК БССР.

Пасьля зацьверджаньня парадку дню, па першым пытаньні,—аб чарговых задачах сацыялістычнага будаўніцтва з дакладам выступіў старшыня ЦВК СССР і БССР тав. Чарвякоў.

Дзёньнік зьезду

26 лістапада на ранішнім пасяджэньні адбыліся спрэчкі па дакладу т. Чарвякова.

⊙ Калгасьніца Зося Лісенка (калгас імя Сталіна, Горацкага раёну) расказала, як працуе іх калгас.

— Уборка ўраджаю—паворыць тав. Лісенка—праведзена вельмі добра, ня зглумілася ніводнага зярняці, ніводнага каліва. Калгас пасьпяхова выканаў збожжазагатоўкі.

Калгасьніцы арганізавалі ўдарную брыгаду і на працягу 2-х тыдняў дапамагалі выбіраць бульбу Дняпроўскай камуне.

⊙ У нашым калгасе,—кажа т. Лабановіч (калгас «Новы шлях» Чырвона-Слабодзкага раёну) пануюць вялікія непарадкі. Праўленьне калгасу ня цікавіцца гаспадаркай. Летась усім пароўну разьмеркавалі ўраджай, хто працаваў, а хто і зусім ня выходзіў на работу.

Сёлета калгас дрэнна справіўся з уборкай Пшаніцу сваячасова ня ўбралі, у выніку чаго яна прарасла.

Дагляд за сьвіньмі дрэнны. Кацёл для варкі бульбы не ўмураваны, сьвіней прыходзіцца карміць сырой бульбай.

Лён да гэтага часу не апрацаваны, праўленьне калгасу ня цікавіцца гэтым.

⊙ Тав. Булгак (Польскі нацыянальны калгас імя газэты «Орка», Бабруйскага раёну). Калгас пасьпяхова справіўся з сяўбой азімины, перавыканаўшы вызначаны плян. Але ня гледзячы на гэта маюцца і прарывы: зяблівае ворыва выканана ўсяго на 40 проц. Зьдзельшчына ў калгасе ня ўведзена.

⊙ Тав. Гутаева (Рагачэўскі раён) апавядае аб тым, што праўленьне калгасу ня цікавіцца працай ў калгасе. Кіраўніцтва адносіцца пагардна да грамадзкай жаночай работы. Калі ёй трэба было ехаць на зьезд, праўленьне нават не дало падводы.

⊙ Карачун Зося (Калгас «Перамога», Вузьдзенскага раёну)

— Доўга ўгаварвалі мяне кулакі, каб я ня йшла ў калгас, але дарэмны іх спробы. Дзьбіла я на месяцы жыта бяз хлеба, а сёлета я сама выпрацавала больш 260 працадзён. Пры разьмеркаваньні ўраджаю на маю долю прыпала: 280 пудоў бульбы, 12 п. жыта і пшаніцы, 23 пуд ячменю, 75 пуд. бульбы і 10 пуд збожжа я злала (прадала) дзяржаве, бо мне столькі не патрэбна.

⊙ Тав. Багумірская (калгас «Пралетары», Дрысенскі раён)—у 1928 г. у нашым калгасе было толькі 8 гаспадарак, сёлета—66 гаспадарак Калгас перавыканаў пляны загатовак Уборка ўраджаю праведзена сваячасова і бяз страт. Уведзена зьдзельшчына, дзякуючы гэтаму значна павялічылася прадукцыйнасьць працы. Замест 12 жанчын адзін га лёну ўбірала 9 чалавек.

⊙ Ад пленуму таварыства Чырвонага Крыжа зьезд прывітала тав. Кісялёва.

⊙ Зьезд вылучыў брыгаду з 6 асоб для прывітаньня зьезду МенАПП'у, які зараз адбываецца ў г Менску.

⊙ Бэйненсон Фрыда (калгас Дамановічы, Мазырскага раёну) заклікае калгасьніц і ўсіх працоўных жанчын прыняць актыўны ўдзел у калгасным будаўніцтве.

⊙ Наш калгас,—кажа т. Зубрыкава (калгас імя Калініна, Церахаўскага раёну) мае сьвінагадоўчы напрамак, Калгас мае зараз 258 галоў сьвіней, Адыход маладняка, у выніку ўвядзеньня зьдзельшчыны і ліквідацыі абязьлічкі, даведзен да мінімуму. Калгас здаў дзяржаве 73 галавы сьвіней, а 80 штук пастаўлена на адкорм.

Калгас таксама мае значны статак дойных кароў. Да гэтага часу здадзена 50 цэнт. малака і адна тона масла.

Дрэнна абстаіць справа з будаўніцтвам сьвінарніка і кухні. Кухня зусім непакрыта, а сьвінарнік толькі напалову. Гонты ёсьць, але няма цьвікоў.

Сьвінаркі не атрымліваюць у тэрмін патрэбны абутак.

⊙ Ад калгасьніц Заходняй вобласьці зьезд прывітала т. Французава.

⊙ Емельянава Ганна (калгас «Расьсьвет новага жыцьця», Стара-Дароскага раёну). Усе загатоўкі калгас выканаў з перавышэньнем. Тав. Емельянава дае абяцаньне ліквідаваць няпісьменнасьць у сваім калгасе.

⊙ Ад Калгасцэнтру СССР зьезд прывітала т Краўчанка.

⊙ Тав. Саковіч (калгас «Чырвоны Берег», Аршанскага раёну) расказала, што ў калгасе шырока разгорнута на аснове зьдзельшчыны ўдарніцтва і сацспаборніцтва. Некаторыя жанчыны выпрацоўваюць у дзень па 2 працадні.

Калгас заквасіў для здачы каля 670 тон капусты, здаў 20 тон буракоў, 30 тон бручкі, 40 тон маркоўкі.

Калгас выгадаваў сёлета 22 жарабят і 33 цялят.

Тав. Саковіч выпрацавала да гэтага часу 380 працадзён.

Мільённыя масы калгасьнікаў БССР па бальшавіцку будуць і надалей змагаць а за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў

ЦК КП(б)Б, СНК і ЦВК БССР

Першы Ўсебеларускі зьезд калгасьніц, які сабраўся для вырашэньня важнейшых, далейшых задач калгаснага будаўніцтва і падагульваньня вопыту арганізацыі калектыўнае вытворчасьці, пасылае свайму правадыру і арганізатару, камуністычнай партыі Беларусі, у асобе яе ленінскага ЦК, а таксама ЦВК і СНК гарачае прывітаньне.

Зьезд запэўнівае ЦК КП(б)Б, што мільённыя масы калгасьнікаў БССР па-бальшавіцку будуць змагацца за хутчэйшае выкананьне пастаўленай перад намі камуністычнай партыяй задачы арганізацыйнага і гаспадарчага ўмацаваньня нашых калгасаў, рашучага падвышэньня таварнасьці калектыўнае гаспадаркі і максымальнага выхаду таварнай прадукцыі для продажу дзяржаве.

Выжываючы з нашых радоў дробна-буржуазныя ўласьніцкія спажывецкія перажыткі, ачышчаючы свае рады ад кулацкіх элемэнтаў—мы калгасьнікі БССР аб'ядноўваемся навакол свайго кіраўніка — камуністычнай партыі, пад яе кіраўніцтвам на аснове арганізацыйнага і гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў завяршым суцэльную калектывізацыю і канчаткова ліквідуем свайго зацятага ворага—кулацтва, як клясу.

Няхай жыве КП(б)Б—наш правадыр і арганізатар.

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЕЗДУ.

„Усе сілы на барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў

ЦК КП(б)Б, Менгаркому КП(б)Б, Белкалгасцэнтру і Мен арса ету

Канфэрэнцыя жанчын-калгасьніц і аднаасобніц-бяднячак і сераднячак—ударніц Менскага раёну, пасылае шчырае прывітаньне.

Канфэрэнцыя сабралася ў той час, калі рабочая кляса, пад выпрабаваным кіраўніцтвам ленінскай партыі, з посьпехам завяршае трэці рашаючы год пяцігодкі—плян вялікіх работ па індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, узмацненьні абароназдольнасьці сацыялістычнай бацькаўшчыны пралетарыяту ўсяго сьвету.

Мы, дэлегаткі, удзельніцы раённай канфэрэнцыі запэўніваем, што ўсе свае сілы накіруем на барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ўзьняцьце ўраджайнасьці і арганізацыю працы ў калгасах, шляхам рашучага ўкараненьня зьдзельшчыны, на аснове цьвёрдых норм выпрацоўкі і дасканальнага вучоту колькасьці і якасьці працы кожнага калгасьніка: за датэрміновае сканчэньне ўсіх відаў загатовак вядучы барацьбу з спажывецкімі настроямі, якія маюць месца сярод асобных адсталых калгасьнікаў.

Будзем весьці самую рашучую барацьбу з клясавым ворагам—кулаком, які зараз імкнецца падарваць калгаснае будаўніцтва ўнутры, рашуча выкрываючы і ачышчаючы свае калгасы ад пралезшых туды кулацкіх элемэнтаў.

Шляхам паладжваньня работы грамадзкіх арганізацый—АСО, МОПР і сваім масавым уступленьнем у іх рады—узмацнім абароназдольнасьць нашай краіны.

Няхай жыве камуністычная партыя—кіраўнік і арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва СССР!

Прэзыдыум канфэрэнцыі.

Ордэн Чырвонага Сьцягу—лепшым барацьбітом за пяцігодку

Палесдрук скончыў пяцігодку за 2½ гады

Прозыхыум ЦСПСБ заслухаў даклад дырэктара Гомельскай друкарні «Палесдрук», ЦП саюзу друкароў і паперніка ў БССР аб выкананьні «Палесдрукам» свайго пяцігадовага пляну ў 2½ гады.

У выніку творчага энтузіязму і бальшавіцкай настойлівасьці рабочага калектыву і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу «Палесдрук» свой пяцігадовы плян выканаў ў 2½ гады. За 1930 год выпушчана прадукцыі больш як на 5 млн. р., замест прадугледжаных на апошні год пяцігодкі 4.981.000 руб. Прадукцыйнасьць працы выкананa на 108,7 проц., сабекошт вынікаў зьвыш пяцігадовага пляну на 1,6 проц.

За пасьпяховае выкананьне пяцігадовага пляну ў 2½ гады прэзыдыум ЦСПСБ узнаў хадайніцтва перад ЦВК і СНК БССР аб узнагародзе «Палесдруку» ордэнам Чырвонага Сьцягу.

За заслугі ў арганізацыі працы, у справе вынаходніцтва і рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў па арганізацыі ўдарных брыгад, што садзейнічала павышэньню росту прадукцыі і выкананьню пяцігадовага пляну ў 2½ гады, рад таварышоў будуць узнагароджаны ганаровымі прэміямі.

Узьнята пытаньне аб дасягнаваньні 15.000 руб. на пабудову інтэрнату і клюбу для рабочых друкарні «Палесдруку», 45.000 р. на палепшаньне грамадзкага харчаваньня і 5.000 руб. на прэм'яваньне лепшых ударнікаў.

Прэзыдыум ЦСПСБ упэўнены, што калектыў рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал друкарні «Палесдрук» ня спыняцца на дасягнутых посьпехах, не паслабяць дасягнутых тэмпаў працы, але яшчэ з большай адданасьцю будуць змагацца за перавыкананьне не пляну трэцяга рашаючага, за бальшавіцкую падрыхтоўку і выкананьне пляну 4 году пяцігодкі, ма білізуючы ўсе свае сілы на бальшавіцкае ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых тав. Сталіным. (Белта).

Аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў

Пастанова аб'яднанага Пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б канстатуе вялізарныя посьпехі дасягнутыя ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі БССР.

На 1-XI-31 г. калектывізавана 50 проц. бядняцка - серадняцкіх гаспадарак па Рэспубліцы; 57,4 проц. па раёнах дзейнасьці МТС і 57,2 проц. па ільнаводных раёнах. 9 раёнаў ужо завершылі ў асноўным суцэльную калектывізацыю. Калектывізацыя паловы бядняцка - серадняцкіх гаспадарак Рэспублікі зьяўляецца вялізарнай перамогай партыі, лепшым доказам правільнасьці яе генэральнай лініі.

Перавод сельскае гаспадаркі на рэйкі буйнага сацыялістычнага земляробства ўжо забясьпечыў значныя посьпехі ў сельска - гаспадарчай вытворчасьці (пашырэньне пасеўных плошчаў, пашырэньне плошчаў пад тэхнічнымі культурамі (лён з 140.000 да 230.000), падвышэньне ўраджайнасьці, таварнасьці сельскае гаспадаркі і г.д.).

Калгасы ў правядзеньні веснавой сяўбы, уборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы паказалі шэраг далейшых пераваг буйнае калектыўнае гаспадаркі над дробнай, аднаасобнай (прыпадае абагуленага пасеву яравых на адну калгасную сям'ю 4,04 га супроць 2,43 га на сям'ю аднаасобнай гаспадаркі і на 1 цягавую адзінку ў калгасах 4,5 га, у аднаасобнікаў 2,3 га, пасеў тэхкультур 0,4 га на адну калгасную сям'ю супроць 0,2 га на сям'ю аднаасобнае гаспадаркі).

Разгорнута значная работа па спэцыялізацыі калгасаў (на 1-XI-31 г. арганізавана 1.064 МТКФ з пагалоўем буйнай рагатай жывёлы 126.248, з якіх 74.138 дойных; арганізавана 889 фэрм па вырошчываньню цялят; 1.600 ТСФ, у якіх пастаўлена 71.000 дарослых сьвіноматак; 131 ПТКФ і 43 конегадоўчых фэрмы).

КП(б)Б здолела дасягнуць такіх посьпехаў толькі на аснове пасьпяховага вырашэньня задачы індустрыялізацыі краіны, як асновы ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва і ў выніку барацьбы супроць правага ўхілу, «лявацкіх» загібаў, вялікадзяржаўнага шавінізму і контр - рэволюцыйнага нацдэмакратызму.

Аднак Пленум ЦК і ЦКК з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае, што дасягнутыя посьпехі ў арганізацыі калгаснай вытворчасьці зьяўляюцца толькі яшчэ першапачатковымі, не выкарыстоўваюцца яшчэ тыя магчымасьці разьвіцьця высока - таварнай гаспадаркі, якія забясьпечваюцца буйнай калектыўнай гаспадаркай, умовамі савецкага ладу і той вялізарнай вытворчай дапамогай, якая аказваецца калгасам з боку пралетарскай дзяржавы.

Усё яшчэ нізкі выхад таварнай прадукцыі, нізкая ўраджайнасьць, нізкая ўдойлівасьць, эусім нізкі процант выхаду таварных сьвіней, вялікае асяданьне таварнай прадукцыі ўнутры самых калгасаў, шырока распаўсюджаны спажывецкія настроі і вынікаючыя адсюль выпадкі рвацтва і г.д.

У пытаньнях аб тэмпах калектывізацыі і далейшых задачах у калгасным руху, кіравацца ўказаньнямі ЦК УсеКП(б), устанаўліваючымі, што «меркай завяршэньня калектывізацыі таго ці іншага раёну ці вобласьці зьяўляецца не абавязковыахоп усіх 100 проц. бядняцка - серадняцкіх гаспадарак, а ўцягненьне ў калгасы ня менш 68—70 проц. сялянскіх гаспадарак з ахопам ня менш 75—80 проц. пасеўных плошчаў сялянскіх гаспадарак».

БССР, якая адносіцца па характару сельскае гаспадаркі да раёнаў спажываючай паласы, павінна вызначыць сваю работу ў галіне калгаснага руху, кіруючыся наступнымі паказаньнямі ЦК УсеКП(б): «У астатніх раёнах СССР, у тым ліку і ў раёнах спажываючай паласы, ЦК прапануе весьці работу па калектывізацыі з такім разьлікам, каб у асноўным скончыць калектывізацыю ў 1932-33 г. г.

ЦК асабліва перасьцерагае арганізацыі гэтых раёнаў і абласьцей ад пагоні за раздутымі процантамі калектывізацыі.

ЦК прапануе гэтым арганізацыям сканцэнтраваць увагу работнікаў на задачу палепшаньня арганізацыйна-будаўнічай работы калгасаў і ўзмацненьню раней за ўсё ільнаводных і гародных калгасаў».

У сувязі з гэтым, на падставе пастановы ЦК УсеКП(б) ад 2-VIII-31 г. аб тэмпах далейшай калектывізацыі і задачах умацаваньня калгасаў, пленум пераглядзеў пастанову ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б у той частцы, якая ставіць перад партарганізацыяй задачу дабіцца вясной 1932 году ахопу 75 проц. сялянскіх гаспадарак і суцэльнай калектывізацыі да канца 1932 г.», зацьвердзіць пастанову Бюро ЦК ад 10 лістапада аб артыкуле ў «Правдзе» ад 28 верасьня.

Толькі на аснове шырока разгорнутай работы па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў у барацьбе з самацёкам у калгасным будаўніцтве будзе вырашана задача завяршэньня суцэльнай калектывізацыі. Хто падмяняе гэтую асноўную задачу пагоняй за дутымі процантамі калектывізацыі, той ня толькі не разумее асноўных задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на даным этапе, але ідзе супроць лініі партыі.

I

Асноўнымі рашаючымі мерапрыемствамі па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў зьяўляецца ўпартая барацьба за перавыхаваньне мас, за выкарчоўваньне дробна - буржуазных тэндэнцый, за правільную арганізацыю працы, заснаваную на цьвёрдых нормах выпрацоўкі ацэненых у працадніх, сапраўднае ўкараненьне зьдзельшчыны, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, правільную арганізацыю ўліку працы і разьмеркаваньне даходаў выключна па колькасьці і якасьці працы, максымальнае разгортваньне таварных галін гаспадаркі, узьняцьце ўраджайнасьці, максымальны выхад таварнасьці, падбор лепшага кіруючага складу калгаснае гаспадаркі (старшыні, загадчыкі фэрм, брыгадзіры) і выхаваньне сярод калгасных мас уразуменьня неабходнасьці ставіць задачу сацыялістычнага будаўніцтва, свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай на першы плян, як першачарговыя. Па гэтай лініі будзе нанесены зьнішчальны ўдар клясаваму ворагу —кулаку і яго агентуры ў партыі— апартуністым розных адценьняў.

Вопыт работы значнай часткі калгасаў паказаў, што там, дзе добра і правільна была арганізавана праца, там вышэй прадукцыйнасьць працы; своячасова выконваліся вытворчыя за даньні, менш было страт, большая атрымана даходнасьць.

Між тым, задача правільнай арганізацыі працы, укараненьне сапраўднай зьдзельшчыны далёка ня ўсімі арганізацыямі пастаўлена ў асяродак увагі. На значнай частцы калгасаў зьдзельшчына існуе формальна, на справе пануе падзёншчына. Ня рэдкія выпадкі, калі нават кіруючыя работнікі Калгассаюзу самі не разумеюць прынцыпаў зьдзельшчыны і тэхнікі яе правядзеньня. Зусім слабы раённы інструктаж па пытаньнях арганізацыі і практычнага правядзеньня зьдзельшчыны ў калгасах. Зусім неда статкова асьвятляецца лепшы вопыт зьдзельшчыны ў друку.

Пленум прапануе Калгасцэнтру, на аснове выяўленага вопыту правядзеньня зьдзельшчыны ў калгасах, у месячны тэрмін распрацаваць канкрэтныя паказаньні па удасканаленьні яе, і па ўзьняцьці працоўнай дысцыпліны і барацьбе з прагуламі, у прыватнасьці:

а) перагледзець прыкладныя нормы выпрацоўкі, арыентуючыся на фактычную выпрацоўку лепшых перадавых калгаснікаў, і прыняць меры, каб на аснове прыкладных норм у кожным калгасе былі распрацаваны свае нормы выпрацоўкі на 1932 г.

б) Правесьці шэраг курсаў і канфэрэнцый на працягу зімовага перыяду па азнаямленьні з прынцыпамі і тэхнікай зьдзельшчыны, арганізацыяй работы, паклаўшы ў аснову пры практычным ажыцьцяўленьні зьдзельшчыны наступныя прынцыпы: устанаўленьне сталага складу асноўнага ядра брыгад з даручэньнем утварэньня шэрагу зьвязаных паміж сабой працэсаў с.-г. работы (напр.: даручэньне адной брыгадзе ўсіх працэсаў працы, пачынаючы ад пасеву і канчаючы ўборкай і абмалотам); правядзеньне работ на аснове брыгаднай і групавой зьдзельшчыны з індывідуальным улікам працы кожнага калгасніка ўнутры брыгады і групы і пераходу на індывідуальнае заданьне ўнутры брыгады на тых работах, дзе гэта магчыма ажыцьцявіць;

в) распрацаваць канкрэтныя паказаньні аб паступовым пераводзе ўсіх відаў работ на прагрэсыўна - прэміяльную зьдзельную працу, аднак формы арганізацыі зьдзельнай прэміяльнай працы павінны быць такімі, якія-б былі добра зразумелымі калгасным масам.

Адным з найбольш распаўсюджаных скажэньняў зьдзельшчыны зьяўляецца абмяжаваньне працягласьці рабочага дню ў гадзінах і ўлік ня колькасьці і якасьці выкананай работы, а часу праведзенага на рабоце;

г) пленум указвае на няправільнасьць маючаяся ў шэрагу месц практыкі ўстанаўленьня працягласьці рабочага дню ў цьвёрдай колькасьці гадзін. Працягласьць рабочага дню калгасьніка выцякае і вызначаецца аб'ёмам работы і тэрмінам выкананьня гэтага заданьня;

д) РК КП(б)Б забясьпечыць сыстэматычны кантроль і праверку работы калгасных і зямельных органаў па арганізацыі працы ў калгасах, перавод на зьдзельшчыну, правільны ўлік працы, правільнае разьмеркаваньне даходаў і выдачу авансаў. Выдача ўсіх авансаў павінна праводзіцца выключна па працадніх;

РК КП(б)Б павінны правесьці 3—4 дзённыя курсы - канфэрэнцыі вясковых камуністаў і раённага актыву па вывучэньні прынцыпаў і тэхнікі правядзеньня зьдзельшчыны ў калгасах.

е) Калгасцэнтру і раённым саюзам забясьпечыць такі кантроль за своячасовым запісам працадзён, каб дырэктывы ЦК аб запісах працадзён у працоўныя кніжкі не радзеяў аднаго разу ў пяць дзён — абавязкова выконваліся. Устанавіць такі парадак, пры якім тым брыгадзірам, якія несваячасова запісваюць выпрацаваныя калгаснікамі працадні ў іх працоўныя кніжкі, зьніжалася колькасьць працадзён;

ж) разглядаючы арганізацыю адыходніцтва, як адно з важнейшых мерапрыемстваў па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, калгасныя органы справу арганізацыі працы ў калгасах, выкарыстаньне машын і арганізацыю гаспадаркі павінны паставіць так, каб забясьпечыць адыходніцтва ў максымальнай меры.

II

Пленум прызнае нездавальняючай работу па папярэднім разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ў калгасах. Шэраг партыйных і калгасных арганізацый не надалі гэтай кампаніі палітычнага значэньня, як важнейшаму зьвяну ў арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Кампанія разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю разглядаецца як тэхнічная бухгальтэрская справа, няма канкрэтнага кіраўніцтва, працягваецца ў шэрагу раёнаў (Касьцюковіцкі і інш.) выдача аванса ў па едаках, сем'ях і г. д., ня ўвязваецца правядзеньне разьмеркаваньня з задачай першачарговага выкананьня калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай (аванды выдаюцца незалежна ад выкананьня плянаў загатовак), што зьяўляецца простым парушэньнем устаноўленага парадку разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю.

Пленум катэгарычна патрабуе ад РК КП(б)Б і калгасных сыстэмы неадкладнага ўзмацненьня работы па разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю, поўнасьцю забясьпечыўшы разьмеркаваньне даходаў па прынцыпу — хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае. Не павінна быць ніводнага выпадку разьмеркаваньня даходаў па ядоцкім, альбо сямейным прызнаку, рашуча выкрываючы перад калгаснымі масамі кулацкую сутнасьць ядоцкага прынцыпу, які вядзе да разбурэньня калгасу.

Павінна быць поўнасьцю выканана паказаньне, што ў першую чаргу выконваюцца калгасамі свае абавязкі перад дзяржавай па здачы (продажу) таварнай прадукцыі, а потым толькі стваральваюцца фонды і выдаюцца авансы.

Пленум лічыць зусім недапушчальным спазьненьні ў разьмеркаваньні ўраджаю і зварочвае ўвагу ўсіх РК на палітычную важнасьць своячасова га выкананьня ўказаньня бюро ЦК аб тым, каб кожны калгаснік у парадку аванса выдачы атрымліваў-бы ў блізкійшыя дні ня менш паловы належачай яму долі з тым, каб канчатковае разьмеркаваньне ўраджаю ў калгасах было закончана да 15 студзеня 1932 г.

Ня было таксама скарыстана выкананьне калгасамі плянаў загатовак як адно з мерапрыемстваў арганізацыйна - гаспадарчага замацаваньня калгасаў таму, што масавая работа навакол загатовак была ў значнай ступені заменена адміністраваньнем, камандваньнем, прадпісаньнямі замест шырокага прыцягненьня калгасных мас на выкананьне калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай і выхаваньня сярод калгасных мас зразуменьня таго, што калгасы як сацыялістычны сэктар гаспадаркі павінен быць прыкладным у выкананьні сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай, з правядзеньнем адначасовай барацьбы з рвацкімі, спажывецкімі тэндэнцыямі, з кулацкай агітацыяй і работай за зьмяншэньне плянаў, за зрыў загатовак, і г. д., адстаяньне калгасаў ад аднаасобнага сэктару сьведчыць аб арганізацыйна-гаспадарчай слабасьці калгасаў. Абагульненьне праводзіцца фармальна без афармленьня па належных фондах калгасу; ў шэрагу раёнаў не абагулены яшчэ каровы, коні. Пленум указвае, што сапраўдны пераход да буйнай аграмаджанай гаспадаркі пачынаецца з моманту абагуленьня прадугледжаных статутам сродкаў вытворчасьці. Сапраўдную калектывізацыю, сапраўдны пераход да форм буйнай аграмаджанай сельскай гаспадаркі трэба ацэньваць перш за ўсё па ступені аграмаджаньня сродкаў вытворчасьці, росту непадзельных капіталаў і выхаду таварнай прадукцыі.

У сувязі з тым, што рашэньне партыі аб застаўленьні сядзібнай зямлі ў індывідуальным карыстаньні калгаснікаў у шэрагу выпадкаў выкарыстана для захаваньня пад відам сядзібнай зямлі сваіх індывідуальных гаспадарак, лічыць неабходным там, дзе маюць месца падобныя злоўжываньні падтрымаць ініцыятыву перадавых калгасаў, накіраваную на перагляд разьмеркаваньня сядзібных вучасткаў у бок іх скарачэньня, грунтуючы гэтую працу на шырокай растлумачальнай працы сярод калгаснікаў.

III

Выходзячы з таго, што калектыўная гаспадарка забясьпечвае вялізарныя магчымасьці разьвіцьця высокатаварнай жывёлагадоўлі і самай высокай ураджайнасьці, Пленум ЦК і ЦКК абавязвае ўсе партарганізацыі, савецкія зямельныя і калгасныя органы задачу разьвіцьця жывёлагадоўлі, уздыму ўраджайнасьці, разьвіцьцё такіх галін гэтай гаспадаркі, як гародніцтва, садоўніцтва, пчалярства, рыбная гаспадарка і г. д.,—паставіць цэнтральнай у гаспадарчым умацаваньні калгасаў, для чаго:

а) забясьпечыць выкананьне пастановы ЦК аб вызначэньні напрамку разьвіцьця (спэцыялізацыі) калгасаў да 1-II-32 г. Пры спэцыялізацыі калгасаў у жывёлагадоўчым напрамку выходзіць з таго, што фэрмай павінен зьяўляцца ў асноўным калгас-фэрма.

б) партыйным арганізацыям, савецкім, зямельным і калгасным органам па-бальшавіцку разгарнуць работу па мабілізацыі энэргіі партыйных камсамольскіх сіл калгасных мас, спэцыялістых і ўсіх работнікаў сацыялістычнага земляробства на практычнае вырашэньне задачы рашучага ўздыму ўраджайнасьці для чаго: шырока ўкараняць правільныя севазвароты; палепшыць апрацоўку глебы, арганізаваць правільны догляд за пасевамі, забясьпечыць абавязкова поўную праполку тэхнічных і прапашных культур, раньняю сяўбу і своячасовую ўборку, барацьба са шкоднікамі і са стратамі, абавязковае выкананьне задачы пад'ёму на зяб ўсёй плошчы вызначанай для пасеваў яравых, рашучае пашырэньне засеву гатунковым насеньнем, шырока разгарнуць сэлекцыйную работу, поўнае скарыстаньне штучных і мясцовых угнаеньняў, асабліва торфу.

Пленум патрабуе ад РК КП(б)Б, НКЗ і Калгасцэнтра, каб у кожным раёне, у разрэзе кожнага калгасу былі распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па ўздыму ўраджайнасьці;

в) Абавязаць Інстытут Сацыялістычнай Рэканструкцыі распрацаваць не пазьней 1 студзеня тыпы севазваротаў спэцыялізаваных калгасаў (малочна-ільняных, жывёлагадоўча-бульбяных, малочна-насеннаводных, малочна-садова-гародных);

г) Пленум абавязвае спэцыяльныя жывёлагадоўчыя калгасныя цэнтры, Калгасцэнтр і РК КП(б)Б забясьпечыць бездакладнае і рашучае ўзмацненьне работы па разьвіцьці калгаснай жывёлагадоўлі. Для таго, каб забясьпечыць большы таварны выхад ад жывёлагадоўлі, неабходна правесьці практычныя мерапрыемствы па ўмацаваньні фэрм, большай канцэнтрацыі ў іх таварнага стада і рашучага павялічэньня удойлівасьці маточнага стада і выхаду таварных сьвіней. Абязьлічка, якая пануе ў доглядзе за жывёлай ў большасьці фэрм, павінна быць бездакладна зьліквідавана і на справе ўведзена сапраўдная зьдзельшчына;

д) Пленум ЦК і ЦКК з усёй рашучасьцю ўказвае, што задача вытворчага ўмацаваньня калгасаў, падняцьце ураджайнасьці, падвышэньне таварнасьці жывёлагадоўлі і інш. галін гаспадаркі, з усёй сілай патрабуе ад калгасных і зямельных работнікаў аўладаньня ў найбольш кароткі тэрмін тэхнікай вядзеньня буйнай сацыялістычнай гаспадаркі, агранамічнымі ведамі, тэхнікай поўнага скарыстаньня с-г. машын і самага шырокага ўжываньня, дасягненьняў агранамічнай навукі, выходзячы з чаго Пленум ЦК і ЦКК абавязвае партарганізацыі, НКЗ і Калгасцэнтр распрацаваць практычныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі выкананьне гэтай задачы і пры падрыхтоўцы масавых кадраў, максымум увагі зьвярнуць на вывучэньне агранамічных ведаў, апрача гэтага шырока паставіць распаўсюджваньне спэцыяльнай навуковай сельска-гаспадарчай літаратуры, арганізацыю гурткоў завочнага навучаньня, правядзеньне спэцыяльных курсаў і г. д.;

е) прызнаючы слабай работу навуковых і дасьледчых устаноў у галіне барацьбы за лепшую арганізацыю калектыўнай вытворчасьці, за узьняцьце ураджайнасьці, падвышэньне таварнасьці жывёлагадоўлі і г. д. (адрыў навуковых і дасьледчых устаноў ад калгасных мас і калгаснай вытворчасьці, адсутнасьць шырока і правільна пастаўленых вопытаў, адсутнасьць гібкасьці ў перанясеньні лепшых, якія ўжо апраўдаліся, вопытаў для шырокага практычнага іх ажыцьцяўленьня) Пленум даручае Бюро ЦК на працягу двух месяцаў прыняць практычныя прапановы, якія-б забясьпечылі рашучае палепшаньне работы навуковых і дасьледчых устаноў, у прыватнасьці—абгаварыць пытаньне аб арганізацыі спэцыяльнага навукова-дасьледчага калгаснага інстытуту, які-б зьяўляўся філіялам Усесаюзнага НІКІ.

У мэтах шырокай пастаноўкі вопытаў найлепшай арганізацыі калектыўнай вытворчасьці, лічыць мэтазгодным арганізацыю ня менш 100 апорных калгасаў, па 1-2 у кожным раёне, з якімі павінна быць устаноўлена непасрэдная сувязь, як з боку Калгасцэнтру, так і Інстытуту Сацыялістычнай Рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

ж) Пленум ЦК і ЦКК адзначае, што завезеная ў бягучым годзе вялікая колькасьць складаных с-г. машын ў значнай ступені выкарыстаны былі нездавальняюча з тэй прычыны, што ня была ліквідавана абязьлічка, прыстаўленыя да машын людзі не аўладалі ў належнай ступені тэхнікай карыстаньня с-г. машынамі (ільноцерабілкі, бульбакапалкі і інш).

Абавязаць калгасныя і зямельныя органы правесьці на працягу зімовага перыяду спэцыяльную работу па аўладаньні калгаснікамі тэхнікай карыстаньня с-г. машынамі, за ліквідацыю абязьлічкі і г. д., забясьпечыўшы ў будучым годзе бязумоўна поўнае і рацыянальнае скарыстаньне с-г. машын.

з) Пленум абавязвае Калгасцэнтр, НКЗ і раённыя партыйныя арганізацыі без адкладна разгарнуць мабілізацыю калгасных мас на падрыхтоўку да вясновай сяўбы. Забясьпечыць своячасовае давядзеньне заданьняў да калгасаў, складаньне вытворча-фінансавых плянаў, рамонт с-г. інвэнтара, транспарту, своячасовы завоз угнаеньня, с-г. машын і г. д.

Пленум абавязвае ўсе арганізацыі прыняць меры забясьпечваючыя поўнае выкананьне плянаў нарыхтовак насеньня, засыпкі насенных фондаў і ачысткі насеньня.

IV

З ростам калектывізацыі адбываецца паступовы процэс узбуйненьня дробных калгасаў, колькасьць якіх значная ў сувязі з надзвычайнай дробнасьцю вёсак, як вынік сталыпінскай і прышчэпаўскай спадчыны.

Працэс узбуйненьня калгасаў зьяўляецца простым вынікам росту калектывізацыі, арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, укараненьня складаных і поўскладаных машын, будаўніцтва і разгортваньня дзейнасьці МТС і па меры перакананьня калгасных мас у мэтазгоднасьці аб'яднаньня, каб забясьпечыць найбольш рацыянальнае скарыстаньне сродкаў вытворчасьці і рабочае сілы. Вырашэньне задачы ўзбуйненьня дробных калгасаў будзе і павінна вырашацца ў залежнасьці ад вырашэньня паказаных вышэй мерапрыемстваў (арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, падвядзеньне тэхнічнай базы, рост сьвядомасьці калгасных мас). Аднак у шэрагу раёнаў гэтыя палажэньні парушаюцца. Ужо дапушчаны ў асобных раёнах памылкі пры правядзеньні ўзбуйненьня калгасаў (адміністраваньне, парушэньне дабраахвотнасьці, штучнае вызначэньне разьмераў калгасаў і г. д.). Ігнаруецца паказаньне т. Сталіна—«Цяпер увага работнікаў павінна быць завострана на арганізацыйна-гаспадарчай рабоце калгасаў і вёсак і сёлах. Калі гэта работа пакажа належныя посьпехі «гіганты» зьявяцца самі сабой».

На даным этапе калгаснага будаўніцтва пры сучасным становішчы калгасаў і ўзроўні мэханізацыі асноўным разьмерам калгасу павінна зьяўляцца вёска-колгас. Узбуйненьне калгасаў можа адбывацца на аснове строгага захаваньня поўнай дабраахвотнасьці і на аснове зацікаўленасьці саміх калгасных мас, на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня існуючых калгасаў, па лініі ўцягненьня ў існуючыя калгасы ваколічных, яшчэ некалектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак; аб'яднаньне калгасаў у адзін там, дзе існуе іх 2-3 у адным вёсцы.

У раёнах з высокім процантам хутарызацыі пры захаваньні паказаных вышэй прынцыпаў, узбуйненьне можа праводзіцца ў сувязі з правядзеньнем спэцыялізацыі калгасаў у напрамку разьвіцьця жывёлагадоўлі, гароднітва, садоўніцтва, пчалярства, па лініі арганізацыі міжколгасных фэрм (МТКФ, СТКФ, прамысловы сад, пасека, прадпрыемствы па пераапрацоўцы малочнай прадукцыі), ці дробных калгасы аб'яднаюцца, каб забясьпечыць магчымасьць арганізацыі той ці іншай таварнай фэрмы і па рашэньні сходу калгаснікаў вызначаецца месца гаспадарчага цэнтру калгасу, выходзячы пры гэтым з гаспадарчай мэтазгоднасьці.

Улічваючы неабходнасьць стварэньня гаспадарчых цэнтраў у тых калгасах, дзе арганізуюцца жывёлагадоўчыя фэрмы ў хутарскіх раёнах, прапанаваць Калгасцэнтру пры распрацоўцы пляну капітальных укладаньняў прадугледзець прыстасаваньне ў гэтых пунктах такой колькасьці жыльлёвых памяшканьняў, якія-б забясьпечылі разьмяшчэньне асноўнага ядра калгаснікаў, даглядаючых за жывёлай.

V

Калгасныя кадры набываюць вельмі важнае значэньне ў справе арганізацыйнага ўмацаваньня калгасаў і правільнай арганізацыі калектыўнай вытворчасьці. Між тым, ні большасьць РК КП(б)Б, ні КГС не звароч валі да гэтага часу належнай увагі падбору, вывучэньню складу кіраўнікоў калгасаў, загадчыкаў фэрм, брыгадзіраў, мае месца засьмечанасьць складу старшынь калгасаў, загадчыкаў фэрм і брыгадзіраў кулацкімі і іншымі антысавецкімі элемэнтамі і людзьмі ўжа нездольнымі кіраваць калектыўнай вытворчасьцю. Амаль па ўсіх раёнах мае месца частая зьмена, адсутнічае сталы зучот калгасных кадраў і практычная дапамога ў іх працы.

Пленум пазнае: а) Калгасцэнтру арганізаваць дасканалы вучот калгасных кадраў (старшыні калгасаў, загадчыкі фэрм, брыгадзіры) забясьпечыўшы падвышэньне кваліфікацыі, як шляхам скліканьня спэцыяльных курсаў, так і шляхам сыстэматычнага правядзеньня спэцыялізаваных па асобных відах работ інструкцыйных вытворчых нарад у межах с-саветаў, куставых і раённых; б) РК КП(б)Б не дапушчаць частай зьмены кіруючага калгаснага актыву, а забясьпечыць лепшы падбор і замацаваньне іх на рабоце на больш працяглы пэрыяд. Лічыць неабходным, каб загадчыкі калгасных тазарных фэрм былі ўключаны ў раённую нумэнклятуру работнікаў. РК забясьпечыць падвышэньне якасьці падрыхтоўкі кадраў; в) Пленум паддзяржджае пастанову ЦК ад 11-IX аб падрыхтоўцы кадраў масавай кваліфікацыі ня менш 100.000 ч., аб пашырэньні цэнтральнай калгаснай школы да 400, школы рахунковых работнікаў да 600 чал. і г. д. Падрыхтоўку масавых калгасных кадраў трэба арганізаваць на аснове вытворчасьці, арганізуючы курсы ў лепшых саўгасах і калгасах.

VI

Задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў патрабуе рашучага палепшаньня апэрацыйнага кансрэтнага кіраўніцтва калгасамі з боку калгаснай сыстэмы і зямельных органаў. Гэта задача можа быць выканана пры рашучым узмацненьні раённага зьвяна Калгассаюзаў МТС, спэцупаўнаважаных і ператварэньня іх у сапраўдныя штабы кіраўніцтва калгаснай вытворчасьцю. Пленум абавязвае РК КП(б)Б пераглядзець і ўзмацніць раённыя калгасныя апараты лепшымі работнікамі і на справе забясьпечыць у іх рабоце практычную дапамогу і кіраўніцтва.

Пленум з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае, што як цэнтральныя органы (Калгасцэнтр, НКЗ, спэцыяльныя калгасныя цэнтры), так і раённыя партыйныя і калгасна-зямельныя органы не перабудавалі яшчэ мэтадаў і форм кіраўніцтва непасрэдна калгасамі (няма канкрэтнасьці, няма дыфэрэнцыяванага падыходу да асобных калгасаў. Нярэдкі выпадкі камандваньня, адміністраваньня замест арганізацыі мас і апэрацыйнага кіраўніцтва).

Пры ажыцьцяўленьні кіраўніцтва калгасамі трэба выходзіць з таго, што калгасы зьяўляюцца дабраахвотнымі аб'яднаньнямі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Таму, ажыцьцяўленьне кіраўніцтва калгасамі патрабуе самай шырокай масавай работы сярод саміх калгасных мас, работы па ўзьлыме іх самадзейнасьці і творчай ініцыятывы і ні ў якім разе не падменай масавай работы, работы па арганізацыі мас і кіраўніцтва імі, голым адміністраваньнем і камандваньнем. Такія мэтады кіраўніцтва прыносяць вялізарную шкоду калгаснаму будаўніцтву. Патрэбна безадкладна ліквідаваць абязьлічку ў кіраўніцтве калгасамі і ўстанавіць такі парадак, каб спэцыялістыя, інструктары і інш. работнікі Калгассаюзаў і МТС былі замацаваны за пэўнай колькасьцю калгасаў, за становішча якіх прымаца ваньня работнікі нясуць поўную адказнасьць.

Калгасны інструктаж у сваёй рабоце павінен абапірацца на па-за штатны інструктаж і калгасны актыў.

Толькі ўпартай штодзённай мэсазай пастаноўкай палітыка-выхаваўчай, вытворчай і агранамічнай прапаганды, можна ў найбольш кароткі тэрмін перавыхаваць учарашняга дробна-улась ніка ў сьвядомага, актыўнага барацьбіта за сацыялізм. Меры адміністрацыйнага і іншага ўзьдзейнічаньня трэба прымаць у адносінах злачынцаў, растратчыкаў, рвачоў, ворагаў калгаснае гаспадаркі, аднак, ва ўсіх выпадках трэба, каб у абгаварэньнях тых ці іншых мер узьдзейнічаньня прымала ўдзел калгасная маса. У мэтах арганізацыі шырокай паліт-выхаваўчай прапаганды сярод калгаснікаў, Пленум даручае Бюро ЦК распрацаваць мерапрыемствы па палітвыхаваньню калгасных мас (вячэрнія школы, гурткі, радыё, лекцыі, даклады, спэцыяльнае правядзеньне днёў калгаснікаў і г. д.). Даручыць Калгасцэнтру правесьці практычныя мерапрыемствы па зьмяншэньні колькасьці аслабанёных работнікаў у калгасах, зьвёўшы да мінімуму колькасьць працадзён затрачаных на аслабанёных работнікаў.

У мэтах узмацненьня і палепшаньня кіраўніцтва калгасамі з боку калгасных органаў, Пленум даручае Бюро ЦК і РК узмацніць кіруючы склад спэцыяльных калгасных цэнтраў, раённых упаўнаважаных, надаць ім большую самастойнасьць у іх рабоце, патрабуючы адначасова большай канкрэтнасьці і адказнасьці за становішча спэцыялізаваных калгасаў.

У мэтах узмацненьня кіруючага складу калгасаў і ачысткі іх ад кулацкіх элемэнтаў, Пленум даручае Калгасцэнтру і РК КП(б)Б праводзячы сыстэматычную работу па ачыстцы калгасаў ад кулакоў, правесьці перавыбары кіруючых органаў калгасаў па сканчэньні гаспадарчага году.

У вырашэньні задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў вялізарную ролю і адказнае месца павінны займаць спэцыялісты сельскае гаспадаркі.

Пленум ЦК і ЦКК абавязвае НКЗ, Калгасцэнтр і РК КП(б)Б прыняць меры да максымальнага скарыстаньня маючыхся спэцыялістаў, а таксама для паскарэньня падрыхтоўкі спэцыялістаў, палепшаньня якасьці падрыхтоўкі, лепшы падбор студэнтаў і стварэньня для спэцыялістых лепшых умоў працы.

Наркамзему і Калгасцэнтру прыняць практычныя захады да больш правільнага разьмеркаваньня спэцыялістых паміж раёнамі, выходзячы з спэцыялізацыі раёнаў.

VII

Надаючы вялізарную рашаючую ролю МТС у арганізацыі высока-таварнай калектыўнай вытворчасьці і ўзмацненьня калгасаў. Пленум патрабуе ад усіх партыйных, калгасных і зямельных органаў і Трактарацэнтра прыняцьця рашучых мерапрыемстваў па палепшаньні работы МТС, па сапраўдным разгортваньні іх дзейнасьці, як асноўных вагароў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

НКЗему, Калгасцэнтру і Трактарацэнтру распрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы па перабудове дзейнасьці МТС такім чынам, каб яны абслугоўвалі ня толькі паляводзтва, але адыгрывалі-бы вядучую ролю ў дачыненьні да спэцыялізаванага напрамку калгасаў ільнаводнага, жывёлагадоўчага, садова-гароднага з тым, каб дабіцца максымальнага скарыстаньня трактарнай сілы, таксама і па ўсіх работах зьвязаных з вырашэньнем кармавой проблемы, уборкі гародніны, пераапрацоўкі лёну і г. д.

VIII

Задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў патрабуе над калгасных, зямельных і савецкіх органаў больш энэргічнай работы па мабілізацыі сродкаў як калгасаў, так і асабліва калгаснікаў на капітальныя ўкладаньні, машынізацыю будаўніцтва МТС, падрыхтоўку калгасных кадраў і г. д. Пленум в усёй катэгорычнасьцю патрабуе значна большага скарыстаньня мясцовых буйнічых матэрыялаў пры правядзеньні будаўніцтва ў калгасах, палепшаньня самаго будаўніцтва, спрашчэньня і патаньненьня кошту яго. У прызатнасьці, Пленум высоўвае перад ўсімі калгасамі задачу неадкладна скончыць пачатыя будаўніцтвы недапушчаючы да амярцьвеньня капіталаў.

IX

Пасьпяховае вырашэньне задачы арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў немагчыма без належнага ўздыму культурнасьці калгасных мас. Пленум абавязвае НК Асьветы, НКАховы Здароўя і Калгасцэнтр больш шырока разгарнуць практычную работу па ліквідацыі няпісьменнасьці, пашырэньні і палепшаньні работы пачатковых школ, школ калгаснай моладзі, школ дарослых, хутчэйшым правядзеньні ўсеагульнага навучаньня, арганізацыі хат-чытален, клюбаў, чырвоных куткоў, распаўсюджэньне друку, выдань не насьценных газэт, плякатаў, ясьлі, радыё і г. д. На працягу месячнага тэрміну ўнесьці сумесна з належнымі аддзеламі ЦК практычныя прапановы на разгляд ЦК па выкананьні гэтай дырэктывы.

X

Зрухі, якія адбыліся ў суадносінах клясавых сіл на вёсцы і паміж асноўнымі вытворцамі сельска-гаспадарчае прадукцыі, патрабуюць рашучай перабудовы ў палепшаньні кіраўніцтва калгаснай вытворчасьцю з боку партыйных і савецкіх органаў, патрабуе таго, каб камуністы і камсамольцы былі заўсёды прыкладнымі ў рабоце калгасаў і ініцыятарамі і сапраўднымі бальшавікамі ў барацьбе за колькасныя і якасныя паказчыкі працы. Кіраўніцтва калгасамі з боку РК КП(б)Б, партыйных ячэек, РВК і сельсаветаў павінна быць сугуба практычным і канкрэтным. РК КП(б)Б павінны забясьпечыць правільную расстаноўку партыйных і камсамольскіх сіл унутры калгасаў. Расстаноўка партыйных сіл павінна быць такой, каб забясьпечыць партыйным к

Гаспадарчы разьлік--

ва ўсе зьвены работы прамысловасьці

Цалкам аўладаць тэхнікай новай крэдытнай рэформы

Кантроль рублём— на вышэйшую ступень

НОВАЯ ФОРМА КРЭДЫТАВАНЬНЯ Ў ВІЦЕБСКУ НЯ ЎСІМІ ГАСПАДАРЧЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ ЎЯЎЛЕНА

Рашэньні партыі і Ўраду аб новых формах крэдытаваньня зьяўляюцца дакумантам выключна важнага палітычнага значэньня. Гэтыя рашэньні ёсьць праграма далейшага бальшавіцкага наступу па ўкараненьні гаспадарчага разьліку, падняцьці кантролю рублём на вышэйшую ступень.

Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР зусім правільна адзначае, што «гаспадарчыя органы, якія не падрыхтуюцца да новага парадку крэдытаваньня ня могуць атрымаць крэдыту ў банку і адказнасьць за цяжкасьці, якія будуць пастаўлены прадпрыемствы з-за нераспараджальнасьці і непадрыхтаванасьці гаспадарчых органаў, ляжа на кіраўнікоў апошніх».

Як-жа прадпрыемствы Віцебску, гаспадарчыя ўстановы, а разам з імі і дзяржбанк падрыхтаваліся да ўкараненьня новай крэдытнай формы і праводзяць яе ў жыцьцё?

Падрыхтоўка

Рыхтуючыся да гэтай важнейшай палітычнай справы, дзяржбанк правёў вялікую папярэднюю работу. За кастрычнік месяц праведзена 5 нарад па пытаньні пераходу на новыя формы крэдытаваньня з кіраўнікамі гаспадарчых устаноў і галоўнымі бухгальтарамі. Гэтыя нарады праводзіліся па галінах прамысловасьці. Праведзена 1 нарада адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу, вучотнага апарату і прафактыву мэталяпрамысловасьці.

Укараненьне новай крэдытнай формы было пастаўлена спэцыяльным пытаньнем на пашыраным пленуме гаркому КП(б)Б супольна з актывам. Сталіся даклады крэдытна-плянавых працаўнікоў банку на куставых нарадах, леспрамгасу, прамтрэсту, на шырокіх сходах рабочых і служачых акулярнай фабрыкі, імя Лекерта «Сьцяг індустрыялізацыі», скуразаводу і інш.

З 1-га лістапада Віцебскае аддзяленьне дзяржбанку мела поўную магчымасьць працаваць па новых формах крэдытаваньня.

Праведзены рэйд па праверцы падрыхтаванасьці і правядзеньня прадпрыемствамі і гаспадарчымі ўстановамі новай формы крэдытаваньня паказаў, што на шэрагу прадпрыемстваў як завод «Чырвоны Мэталіст», фабрыка «Прафінтэрн», ЦРК, гэтае пытаньне прапрацавалі, але бяз удзелу шырокіх колаў рабочае грамадзкасьці. На скліканыя дзяржбанкам нарады ні адзін з сакратароў партыйных ячэек і калектываў, ні адзін старшыня фабкому не зьявіліся, што сьведчыць аб палітычнай недаацэнцы з іх боку гэтай важнай справы. Такая-ж недаацэнка праяўлена дырэктарам абутковай фабрыкі імя Фабрыцыуса, Лембергам, дырэктарам шклогуты «Ноўка» і кіраўніцтвам вапнянога заводу і як вынік частка з гаспадарнікаў, ня маючы нават і ўяўленьня аб новай форме крэдытаваньня, дапусьцілі шэраг памылак, і скажэньняў, якія прадпрыемствам абышліся ў не малыя грошы.

Характарным прыкладам можа служыць фабрыка імя Фабрыцыуса, якая з-за напляваўдельскіх адносін дырэктара і бухгальтара да новай формы крэдытаваньня мела буйнейшы прарыў у фінпляне. Атрымаўшы звыш пляну хром, засланы заводам «Бальшавік, не адмовіўшыся ад акцэпту праз банк, згодна новай форме крэдытаваньня, дырэктар і бухгальтар па старынцы напісалі пісьльку пастаўшчыку. У гэты-ж час з-за таго, што тэрмін прайшоў, банк аўтаматычна сьпісаў суму. У выніку быў парушан фінплян, прадпрыемства было аштрафавана за аўтаматычнае сьпісаньне, а рабочыя ў выніку такіх адносін дырэктара і бухгальтара не атрымалі своячасова зарплату.

Да гэтага часу літаральна ўсе прадпрыемствы не забясьпечаны блянкамі форм новага парадку крэдытаваньня. «Оргстрой» не паклапаціўся забясьпечыць віцебскія прадпрыемствы і гаспадарчыя ўстановы неабходнымі матар'ялямі і формамі крэдытаваньня. Нават у прадажы няма ніводнай кніжкі аб правілах новага крэдытаваньня.

На шляху выкананьня новай формы

Становішча з заключэньнем дагавароў на 4-квадру ў адносінах мінулага пэрыяду на шэрагу прадпрыемстваў пагоршылася. Напрыклад фабрыка «Прафінтэрн» заключыла дагавароў на 4 мільёны 921 тысячу рублёў, а павінна была заключыць на 5 міл. 236 тысяч рублёў. Піўзавод усяго на 76 процантаў да вытворчага пляну. Інструментальна - мэблявая фабрыка заключыла толькі на 36 процантаў да пляну ЦРК-ж—рацыў, што лягчэй за ўсё зусім не заключаць ніякіх дагавароў.

У палепшаньні справаздачнасьці ма спца зрух. Дзякуючы вялікаму націску з боку дзяржбанку — кантролю рублём, большасьць прадпрыемстваў мае справаздачныя балянсы на 1-кастрычніка, а некаторыя нават і на 1-лістапада (скураная прамысловасьць, торфазавод) Ганебна адстаюць у справаздачнасьці цагельныя заводы, мясцовая прамысловасьць і спажыўсыстэма, балянс якіх адстаў на два—тры месяцы і вядома, што пазыкі ў банку яны не атрымаюць.

Большасьць прадпрыемстваў мае дырэктыўныя балянсы на 1-ае студзеня 1932 г. і фінплян на 4-квадру. Шмат прадпрыемстваў ужо атрымала зваротныя сродкі ад аб'яднаньняў, якія дзяржбанкам ужо аформлены (металяпрамысловасьць, шэйная і скурачая); адстала ў гэтым напрамку тэкстыльная прамысловасьць, цагельныя заводы і аб'яднаньні будматар'ялаў.

Кантроль рублём дае сябе адчуваць

Некаторыя гаспадарнікі, якія яшчэ не пераключыліся на новыя формы крэдыту ўжо адчуваюць жорсткасьць кантролю рублём. Прыкладна: скуразавод атрымаўшы падэшву, як калісьці думаў, што тавары магчыма атрымаць у любы час, калі пажадаеш і бяз грошай. Спрытны дырэктар заводу тавары Гельфанд піша пастаўшчыку: «мне тавар такі не патрэбен». Аднача сова дырэктар дае загад завесьці гэты-ж тавар да сябе ў склад. Банкжа па распараджэньні пастаўшчыка гэты тавар прадаў фабрыцы «Прагрэс». Гэты ўчынак для дырэктара скуразаводу быў нечаканасьцю. І калі зьявіўся гаспадар, якому банк прадаў тавар, дык дырэктар скуразаводу катэгарычна адмовіўся выдаць тавар, зачыніўшы завадзкія вароты і толькі пры ўмяшаньні пракурора і міліцыі тавар быў узяты.

Такая самаўласная «ўстаноўка» сьведчыць аб палітычнай сьлепаце і дзяляцтве некаторых кіраўнікоў, ігна раваньне з іх боку новай крэдытнай рэформы. Характарна, што пасьля таго як тавар быў прададзены фабрыцы «Прагрэс» у дырэктара скуразаводу аднекуль узяліся грошы і ён зараз-жа выкупіў астатні тавар.

Ня лепшая справа і на абутковай фабрыцы. З-за несвоячасовай аплаты рахункаў банку праданы хром прысланы для фабрыкі на 46 тысяч руб. У выніку такой безгаспадарчасьці і нядбайных адносін да новай формы крэдытаваньня фабрыка мае прарыў з-за адсутнасьці сыравіны.

На панчошнай фабрыцы дае сябе моцна адчуваць няскончаная прадукцыя. Паўфабрыкатаў ёсьць на 500 тысяч рублёў. Гэта стварае фінцяжкасьці. Банкам таксама была прададзена пража на 95 тысяч рублёў. Частку, з якой яны-ж самі выкупілі, заплаціўшы пры гэтым камісійныя банку.

Акулярная фабрыка, якая на працягу доўгага часу давала шмат браку, зараз у зьвязку з новай формай крэдытаваньня прымушана зьвярнуць усю ўвагу на палепшаньне якасьці прадукцыі. З Ленінграду нядаўна была зьвернута фабрыцы забракаваная прадукцыя на 58.597 руб. І адначасова спагналі розных страт на 4.140 руб. Шмат якія пакупнікі адмаўляліся пакупаць прадукцыю фабрыкі і ў выніку на складах фабрыкі ляжыць бяз руху гатовай прадукцыі на суму каля 300 тысяч рублёў. Такім чынам фабрыка ня можа аплаціць дзяржбанку атрыманую пазыку.

Усяго за кастрычнік і лістапад банкам прададзена прадукцыі і сыравіны на суму 312 тысяч рублёў.

264-ты рахунак

Гэты рахунак уведзен адначасова з новай формай крэдытаваньня. На яго пападаюць тыя гаспадарнікі, якія ганебна адстаюць і ня выконваюць свае абавязкі па звароту ўзятых сум у тэрмін. Гаспадарчыя ўстановы, папаўшыя на гэты рахунак, не атрымліваюць пазыкі ад банку акрамя пазыкі на суму ў дарозе. Ня гледзячы на кароткі час існаваньня гэтага рахунку на ім ужо знаходзіліся каля 7 прадпрыемстваў, цагельныя заводы прамтрэсту, выпраўдому, панчошная «Клары Цэткін», Біофабрыка «Зара» і акулярная.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне новай формы крэдытаваньня залежыць ад энэргічнасьці, апэрацыйнасьці і гібкасьці партыйных, прафэсіянальных, гаспадарчых і крэдытных органаў. Віцебскія прадпрыемствы і ўстановы гэта павінны ўлічыць.

Брыгада газэт.: «Савецкая Беларусь», «Рабочий» і «Віцебскі Пралетары».

Шульман, Жыцельзэйф, Эстрын, Левін, Равін.

Месячнік барацьбы за лён

Наркамснаб, Белільнасаюз і Белкаапсаюз

яшчэ не пераключыліся на штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва лёназагатоўкамі

Лёназаводы поўнасьцю не нагружаны, траста паступае марудна

ЗЛАМАЦЬ КУЛАЦКАЕ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ, ЛЕН ПА ЦЬВЕРДЫХ ЗАДАНЬНЯХ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗДАН НЕАДКЛАДНА

Лёназагатоўкам--штодзённы кантроль

Памылкі лёназагатовак мінулага году нічому не навучылі нашы загатоўчыя арганізацыі. Леташнія прарывы паўтараюцца зноў.

Лёназагатоўкі пачаліся даўно, але цэнтральныя сыстэмы—Белкаапсаюз і Белільносаюз—не пераключыліся па баявому на лёназагатоўкі, яны праяўляюць поўную бязьдзейнасьць, загатоўкі ідуць самацёкам.

Гадавое заданьне загатовак лёнавалакна па БССР на 16 лістапада г. г. зыканана толькі на 7,2 проц. Белкаапсаюзам выканана 5,8 проц. заданьня, Белільносаюзам 6,5 проц. Калгасамі і МТС—1,8 проц. Па загатоўках закантрактаванага лёнавалакна як у калгасах так і ў аднаасобным сэктары, заданьне выканана на 4,7 проц. закантрактаванага лёну.

На лепш абстаіць справа і з пянькой, якой на 16 лістапада г. г. загатоўлена толькі 0,6 проц. Белкаапсаюз выканаў на 0,6 проц., Белільносаюз—0,2 проц., калгасы 0,1 проц.; па кантрактацыі загатоўлена толькі 1 проц. заданьня.

Асабліва злачынна адстаюць у галіне лёназагатовак наступныя раёны: Асьвейскі,—які выканаў плян на 0,2 проц., Віцебскі—0,9 проц., Полацкі—0,9 проц. і Бешанковіцкі—0,3 проц. і г. д.

Да апошняга часу сыстэмы ня ведаюць як праходзіць спагнаньне валакна па цьвёрдых заданьнях з кулацка-заможных гаспадарак. Гэтай справай амаль ніхто не займаецца. Трэба зараз-жа налаадзіць вучот і кыканьня цьвёрдых заданьняў і прыняць рашучыя меры да поўнага спагнаньня іх.

Рад райкомаў партыі і райвыканкомы, райснабы, райкаапсаюзы і райспажыўсаюзы стаяць у баку ад лёназагатовак, паклаўшыся на самацёк. Больш таго, асобныя райкаапсаюзы займаюцца самастрахоўкай, пальмаюць крыж аб тым, што лёназагатоўкі зрываюцца быццам таму, што Белкаапсаюз не адгружае прамтакараў для стымуляваньня лёназагатовак. Лёзьнянскі і Азарыцкі райкаапсаюзы пачалі сыгналізаваць у Белільносаюз, што нібы-та не адгружаны яшчэ прамтавары для прэміраваньня лёназдатчыкаў, пры праверцы выявілася, што прэміяльны фонд для стымуляваньня лёназагатовак адгружан яшчэ ў першых чыслах лістапада.

Нельга не сказаць аб тых нядбайных адносінах ,якія пануюць у Наркамснабе. Працаўнік Наркамснабу па лёназагатоўках т. Майзэльс абмяжоўваецца толькі тым, што піша вельмі вялікія дырэктывы раёнам, але-ж ня прымае ніякіх захадаў для практычнага выкананьня пляну лёназагатак.

На запытаньне, як праходзяць лёназагатоўкі і якія ёсьць матар'ялы з месц, т. Майзэльс адказвае: «Вось, бачыце, я пішу ў другі раз зельмі суровую дырэктыву раёнам, але-ж у мяне няма ніякіх матар'ялаў, акрамя гэтага». Справа як вядома ня ў дырэктывах, а ў практычнай дапамозе раёнам, чаго няма.

Трэба адзначыць, што Белкаапсаюз і Белільносаюз, ня гледзячы на надзвычайна марудныя тэмпы загатовак, не паслалі на раён ніводнага работніка.

Трэба зараз-жа мабілізаваць адказных работнікаў па сыстэмах Наркамснабу, Белкаапсаюзу і Белільносаюзу і паслаць на раёны на пасіленьне лёназагатовак і ліквідацыі прарыву.

Наркамснаб павінен арганізаваць сыстэматычны нагляд за выкананьнем пляну.

Раёны павінны пераключыцца па баявому на правядзеньне пляну лёназагатовак.

Да 10 сьнежня павінна быць загатоўлена ня менш 70 проц. гадавога пляну па лёнавалакну. Трэба ўстанавіць суровы кантроль па выкананьню цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнай часткай, прымусіць кулака неадкладна зсаць лён.

А. Б.

НА МЕНШ 70% ЛЁНАВАЛАКНА ДА 10 СЬНЕЖНЯ 1931 Г.

ЗАГАТОЎКА ТЭХКУЛЬТУР ПА БССР

Загатоўлена на 21 лістапада

ЛЁНАВАЛАКНО	СЕМЯ	ПЯНЬКА
7,8 проц	14,9 проц.	0.9 проц.

Было на 16 лістапада

6 3 проц	43,2 проц	0,5 проц.

Даць адпор кулацка-спажывецкім настроям

Плян лёназагатовак па Вушачыне на 13 лістапада выкананы толькі на 13 проц. Між тым раён мае ўсе мажлівасьці, каб своячасова закончыць лёназагатоўкі.

Некаторыя калгасы добра справіліся з лёназагатоўкаў.

Калгас „Пагранічнік" Кубліцкага сельсавету, поўнасьцю выканаў плян па здачы дзяржаве ленавалакна і ільнатрасты. Калгас „Самалёт" Зарачанскага сельсавету, перавыканаў плян па здачы трасты і валакна. Выконваюць пляны па загатоўках як трасты, так і лёнавалакна калгасы „Камунар", „Чырвоны Кастрычнік", „Будаўнік", Жарскага сельсавету. У гэтых калгасах па апрацоўцы лёну былі створаны спэцыяльныя брыгады. Лён апрацоўваўся канвэерам, пачынаючы ад расьцілу, мяцьця і канчаючы здачай яго на загатоўчыя пункты.

Нажаль, большасьць калгасаў раёну не зразумелі яшчэ ўсёй сур'ёзнасьці лёназагатовак.

Калгас „Савецкая Беларусь", М-Далецкага сельсавету, лён апрацаваў, але дзяржаве яго здаваць ня думае. Сярод калгасьнікаў пашыраны спажывецкія настроі. Такія настроі пакуль што не разьбіты. Падобныя настроі пашыраны ў калгасе „Чырвоная Зьмена" Чарапоўшчынскага сельсавету, дзе лён дзяржаве таксама не здаецца.

Яшчэ горш абстаіць справа ў калгасе „Чырвоная Зьмена", Завячэльскага сельсавету. Тут частка лёну яшчэ не паднята са сьцелішчаў, сушыльні і дровы яшчэ не падрыхтаваны, брыгады па апрацоўцы лёну не арганізаваны. У калгасе імя Леніна Сарочынскага сельсавету, лён толькі некалькі дзён таму назад падняты. Апрацоўка яго яшчэ не пачата. Такое-ж самае становішча наглядаецца ў калгасе „Пераможнік", В-Далецкага сельсавету. Новае толькі тут тое, што калгас згнаіў 1,5 тоны ільнасемя, якое лежала пад дзіравым дахам.

Калгас імя Стліна скормлівае семя жывёле. У калгасе „Новае жыцьцё", М-Далецкага сельсавету, ільнасемя раськідана дзе папала, і таксама псуецца. Падняты са сьцелішчаў лён не апрацоўваецца.

Падобныя адносіны да ільнасемя трэба лічыць прамым шкодніцтвам. Вінаватыя павінны быць прыцягнуты да адказнасьці,

Загатоўкі лёнатрасты, лёнасемя і лёнавалакна павінны быць рашуча паскораны.

І. Карцель.

Даць лёназаводу трасту

Траста ёсьць, яе трэба пераапрацаваць

ШКЛОЎ. Лёназагатоўкі па раёне яшчэ не разгарнуліся. На 15 лістапада плян па ленавалакне выкананы ўсяго на 4,5 проц. (калгасы—6 пр., аднаасобнікі—4 проц.).

Некаторыя сельсаветы не зварочваюць ніякай увагі на гэту важнейшую гаспаларча-палітычную кампанію. Не праводзіцца ніякай работы сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, ня прымаюцца захады, каб спагнаць з кулакоў цьвёрдыя заданьні на лёне. Напрыклад, Княжыцкі сельсавет і на сёньняшні дзень ня здаў ніводнага кілё чыстага лёнавалакна; ня ўсім кулакам даны цьвёрдыя заданьні. Княжыцкі сельсавет нават нічога ня ведае пра месячнік лёназагатовак, абвешчаны ЦК КП(б)Б.

Вельмі марудна паступае лёнасалома на лёназавод. На 15 лістапада плян па здачы саломы выкананы ўсяго на 9 проц.

Лёнатраста таксама паступае марудна. На завод здана ўсяго 8,7 пр. З-за недахопу лёнасаломы і трасты лёназавод хутка спыніць сваю работу. Райкалгассаюз і МТС ня выконваюць дагавору па забясьпечаньні заводу лёнасаломкай і трастой.

Яшчэ горш абстаіць справа са здачай пянькі. Паводле пляну, трэба здаць 265 цнт., а здана на 15 лістапада толькі 0,1 цнт.

Такія недапушчальныя тэмпы тлумачацца выключна бязьдзейнасьцю райкалгассаюзу, райкаапсаюзу, МТС і цацканьнем з кулаком.

П. Шклоўскі.

Дарогу ОСТ'ам!

Стандартызацыя павінна знайсьці свае законнае месца на кожным заводзе, фабрыцы і ўстанове

Дзе і што зроблена па месячніку стандартызацыі

(Па матар'ялах рэйду брыгады Белстандарткому і газ. „Савецкая Беларусь")

Цэнтральным Штабам па правядзеньні месячніка стандартызацыі 25-IX была вылучана брыгада з работнікаў Белстандарткому з удзелам прадстаўніка газ. «Савецкая Беларусь» для праверкі прадпрыемстваў і ўстаноў наконт таго, што імі робіцца па правядзеньні месячніка стандартызацыі. Брыгадай былі праверены Наркамасьветы, Наркамснаб і Беллеспром.

У Наркамасьветы брыгада выявіла наступнае:

Штаб па правядзеньні месячніка стандартызацыі арганізаван з 5 чал., складзен плян работы штабу, але да гэтага часу абсалютна нічога ня зроблена па выкананьні пляну. Бюро стандартызацыі ёсьць з 5 чал., але-ж гэта бюро існуе толькі на паперы; за цэлы год было толькі тры паседжаньні бюро і ў гэтых трох паседжаньнях заключылася ўся работа бюро.

Нам. Наркома т. Ошэраў, які сам зьяўляецца адказным членам бюро па стандартызацыі, кажа, што бюро няма чаго рабіць у галіне стандартызацыі, але ён сам сябе супярэчыць, бо ён-жа кажа, што складзен плян работы па правядзеньні месячніка стандартызацыі; значыць, ужо ёсьць работа; затым Наркамасьветы выпрацаваў ведамственныя стандарты на школьную мэблю, але яшчэ не дагаварыліся з ВСНГ аб масавым вырабе гэтай мэблі, ня гледзячы на тое, што гэтыя стандарты ўжо былі гатовы ў сакавіку месяцы г. г., а рэалізацыя гэтага стандарту і нагляд за тым, як ён саблюдаецца—гэта работа бюро стандартызацыі.

Затым ёсьць 4 ВЕСТЫ (ведамственыя стандарты) на будаўніцтва школьных будынкаў—сачыць ,як ужываюцца гэтыя весты—і гэта работа бюро стандартызацыі.

Т. Ошэраў кажа, што патрэбна выпрацаваць стандарты на дзіцячыя цацкі—і гэта работа бюро стандартызацыі.

На запытаньне брыгады «ці ўключана ў праграмы навучальных устаноў пытаньне стандартызацыі?» т. Ошэраў адказаў, што пытаньне стандартызацыі ўключана ў праграмы толькі індустрыяльных тэхнікумаў, але гэтыя праграмы па стандарт. выпрацоўваюць самі выкладчыкі. Ці чытаюцца лекцыі па стандартызацыі, як яны чытаюцца,—аб гэтым Наркамасьветы ня ведае. А між тым, і гэтыя пытаньні—справа бюро стандартызацыі.

Ня прыхозяіцца даказваць, як вельмі важна нам цяпер у разгар сацыялістычнай будоўлі рыхтаваць спэцыялістых па стандартызацыі, а між тым, як відаць, нашы нават вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы не надаюць гэтаму пытаньню дастаткозай увагі.

Неабходна зараз-жа запоўніць гэты вялікі прабел. У нас на прадпрыемствах амаль зусім няма інжынэрна-тэхнічных работнікаў, якія-б дасканала ведалі справу стандартызацыі.

Па Наркамснабу штаб па правядзеньні месячніка стандартызацыі склад дзен 11-IX з 7 чал., але цяпер засталіся толькі 2 чал., а астатнія выбылі зусім. Плян работы штабу складзен, аднак ён ня выконваецца, бо фактычна няма каму працаваць, бюро стандартызацыі няма. Справай стандартызацыі загадвае сэктар рацыяналізацыі, у якім працуе толькі адзін чалавек.

У 6 аб'яднаньнях Наркамснабу арганізаваны штабы па правядзеньні месячніка стандартызацыі, а ўсіх аб'яднаньняў 12. Што робяць гэтыя штабы—Наркамснабу невядома.

Па Саюзхлебе і Белсельпроме арганізаваны брыгады для праверкі саблюданьня прадпрыемствамі ОСТ'аў. Раёнам даны адпаведныя ўказаньні па правядзеньні месячніка. Наркамснабам намечана да стандартызацыі на 1932 г. 23 аб'екты. Пры 6 аб'яднаньнях арганізаваны бюро стандартызацыі, а ці ёсьць бюро стандартызацыі на прадпрыемствах—у Наркамснабе ня ведаюць; як пастаўлена справа бракеражу на прадпрыемствах—аб гэтым, таксама, сам аллах ведае.

Ніхто ня цікавіцца, ці ёсьць адпаведныя ОСТ'ы і літаратура па стандартызацыі на прадпрыемствах. Указаньняў аб гэтым Наркамснаб не даваў.

Былы Лесбел рэарганізован у 4 трэсты: Беллеспром, Лесбел, Белдрэў і Лесаснабзбыт, пры чым Беллеспром аб'яднае апошнія тры трэсты. З вялікімі труднасьцямі Цэнтраштабу па правядзеньні месячніка ўдалося дабіцца арганізацыі пры Беллеспроме штабу па правядзеньні месячніка (агульнага для ўсіх 4 трэстаў) толькі 19-IX, але гэты штаб ледзь на днях склаў плян работы і амаль нічога не зрабіў па выкананьні гэтага пляну.

Падобная маруднасьць у рабоце па правядзеньні месячніка тлумачыцца тым, што адміністрацыя гэтых трэстаў наогул ігнаруе стандартызацыю, не саглядае ОСТ'аў, і нядбайным адносінамі да работы па месячніку старшыць мясцкомаў трэстаў, якія наогул ня думалі праводзіць месячнік ня гледзячы на дырэктыву па гэтым пытаньні, ЦСПСБ. Напрыклад, старшыня МК Лесаснабзбыту т. Лагун наадрэа адмовіўся працаваць у штабе па месячніку калі яго выбралі ў штаб.

Але трэба падкрэсьліць актыўнасьць у справе стандартызацыі работніка аддзелу рацыяналізацыі Лесбелу т. Волкова, які па сваёй ініцыятыве арганізаваў бюро па стандартызацыі ў Лесбеле, і наогул стараецца зрушыць з мёртвай кропкі справу стандартызацыі ў органах лясной гаспадаркі БССР, але ён ня мае падтрыманьня з боку адміністрацыі Лесбелу і Беллеспрому.

Брыгада Белстандарткому і газ. «Савецкая Беларусь»: Мялік, Разаронаў, Бэндзітовіч.

Дрэнная якасьць--вынік адсутнасьці ўжываньня стандартаў

Стандартызацыя гэта адзін з мэтадаў, які дае нам магчымасьць паставіць прамысловасьць на прынцып канвэера, каб патаніць, паскорыць і пазбавіць працэс вытворчасьці ад лішняй затраты працы і рацыянальна скарыстаць сыравіну і паўфабрыкат.

Але з боку паасобных прадпрыемстваў ёсьць недаацэнка стандартызацыі, апартунізм у пытаньні асваеньня сацыялістычнай тэхнікі.

У часе правядзімага месячніка стандартызацыі на буйнейшых прадпрыемствах г. Віцебску «Дзьвіна», «Сьцяг індустрыялізацыі», фабрыка Лекерта і г. д. пытаньні стандартызацыі не знайшлі належнага месца.

Таксама аднесьліся да месячніка партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гэтых фабрык. Пытаньні стандартызацыі не папулярызаваны сярод шырокіх рабочых мас. Рабочыя ня ведаюць аб існуючых табліцах ОСТах і мэтадах правядзеньня іх у жыцьцё.

На усіх заводах і фабрыках амаль што існуюць міжведамственыя стандарты, кантроль над выпускам гатовай прадукцыі, а таксама прыём сыравіны і паўфабрыкатаў. Але гэтая работа праводзіцца па старому, на «вока», не прытрымліваючыся існуючых табліц ОСТаў.

Надта дрэнная справа са стандартызацыяй на фабрыцы «Лекерта». Зараз, фабрыка вырабляе 5-6 асартымэнтаў і кожная зьмена ня мае пэўнага стандарту, у выніку чаго павялічваецца па браку, які часам дасягае да 27 пр. Адсюль і зрыў у выкананьні прамфінпляну (за III квартал выканана каля 70 проц.). Адсутнічае лябараторыя.

Ня лепш абстаіць справа на іншых фабрыках і заводах. Прадпрыемствы забясьпечваюцца сыравінай дрэннай якасьці і неадпаведных стандартаў.

На фабрыцы «Дзьвіна» асноўнай вытворчасьцю фабрыкі зьяўляецца часальна - прадзільная прадукцыя. Фабрыка мэханізавана замежным абсталяваньнем, але ніякай стандартызацыі ня ўведзена. Сталага тэхнічнага кантролю за паасобнымі працэсамі работы няма. Таксама няма сувязі паміж бюро рацыяналізацыі і стандартызацыі.

Надта дрэнна абстаіць справа з забясьпячэньнем табліцамі ОСТ-у і літаратурай па галіне стандартызацыі ГІЗ-ам. У магазынах поўная адсутнасьць патрэбных табліц і кіруючай літаратуры.

Кіраўніцтва стандарцізацыяй у горадзе няма. Інспэктары - кантралёры практычнай працай па стандартызацыі не займаюцца.

Калека.

З фронту збожжазагатовак

У ВЫНІКУ ЎДАРНАЙ РАБОТЫ па правядзеньні збожжазагатовак Барвінаўскі сельсавет, Уваравіцкага раёну, перавыканаў гадавы плян. Сельсавет і партячэйка мабілізавалі дасюл збожжазагатовак грамадзкую думку калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў. Цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак спагнаны поўнасьцю.

А. Казіміраў.

Марудным тэмпамі выконваюцца пляны збожжазагатовак калгасамі «Чырвоны Шлях» і імя Леніна, Уваравіцкага раёну, гэтыя калгасы збожжазагатоўкі яшчэ толькі пачынаюць. Старшыня калгасу імя Леніна Чыстоў (член партыі) падпаў пад уплыў кулацка-спажывецкіх настрояў і адмаўляецца выконваць плян збожжазагатовак, матывуючы гэта нібы «адсутнасьцю тавараных лішкаў». Не лік відаваны месьніцкія тэндэнцыі і ў калгасе «Чырвоны Шлях», «Дружба», «Чырвоны Кастрычнік» і некаторых іншых. Гэтыя калгасы ганебна цягнуць уніз крывую выкананьня раённага пляну збожжазагатовак.

К.

За „Чырвоную кнігу саветаў"

Чырвонаштандарнае настаўніцтва БССР

—уключылася ў сацспаборніцтва саветаў—

Ажыцьцяўляючы пастанову ЦК УсеКП(б) аб ніжэйшай і сярэдняй школе. Ператварыць БССР да 1 мая 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці

Нашы першыя вынікі змаганьня за месца ў „Чырвонай кнізе"

У рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь"

Мазырскі гарсавет уключыўся нядаўна ў сацспаборніцтва за ганаровае месца ў «Чырвонай кнізе саветаў», але ўжо можна падагуліць першыя вынікі выкананьня праграмы-мінімуму.

1. Завербавана добраахвотнікаў у сэкцыі савету—25 чал. з вытворчасьці.

2. Распрацавана пастанова ЦК, ЦКК і ЦСПСБ аб практычным удзеле рабочых у рабоце дзяржустаноў, не адрываючы іх ад вытворчасьці. На пашыраным пленуме ўсіх сэкцый і дэпутацкіх груп гэта пытаньне абгаворвалася для прыняцьця канкрэтных мерапрыемстваў.

4. Арганізавала дэпутацкая група і ўдарная брыгада на заводзе «Пралетары».

4. Арганізавана дэпутацкая група сярод будаўнікоў, якая выканала ўжо свой прамфінплян за лістапад і выклікала дэпутацкія групы заводу «Пралетары» на сацспаборніцтва ў галіне выкананьня свайго прамфінпляну.

Старшыня гарсавету.
Сакратар.

30 тысячная армія асьветнікаў БССР

уключаецца ў сацспаборніцтва за перабудову работы саветаў, за стварэньне „Чырвонай кнігі"

(Пастанова прэзыдыуму ЦП працасьветы)

Выходзячы з палітычнай важнасьці разгортваемага сацпаборніцтва паміж саветамі за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў», прэзыдыум ЦП працасьветы пастанаўляе:

1. Ад імя ўсяе асьветніцкай армії ўключыцца ў спаборніцтва за перабудову работы саветаў, за стварэньне «Чырвонай кнігі саветаў».

2. Прапанаваць усім гаррайкомам саюзу разгарнуць масавую працоўку па сваіх нізавых арганізацыях праграмы-мінімуму, выпрацаванай газэтай «Савецкая Беларусь» (гл. газ. «Сав. Бел.» за 20-х № 244) і на падставе яе распрацаваць плян канкрэтных мерапрыемстваў па даным гарсавеце, сельсавеце, местсавеце, разгарнуўшы сацспаборніцтва і ўдарніцтва гарадзкіх, раённых і нізавых арганізацый асьветнікаў на лепшы ўдзел у перабудове работы саветаў.

3. Вызначыць прэміяльны фонд у разьмеры 1500 руб. для прэміяваньня лепшай саюзнай арганізацыі і асобных асьветнікаў за лепшыя паказчыкі ў правядзеньні гэтай работы.

4. Зацьвердзіць адозву да ўсіх асьветнікаў БССР аб актыўным удзеле іх у перабудове работы саветаў.

Да ўсіх асьветнікаў БССР

Па ўсім Савецкім Саюзе і па БССР ідзе вялікая работа па перабудове работы органаў пралетарскай дыктатуры—саветаў. Ва ўмовах сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва, калі мы, рашуча выкарчоўваючы капіталістычныя элементы, уступілі ненасрэдна ў эпоху пабудовы сацыялізму,—роля саветаў, асабліва сельсаветаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі значна павялічваецца.

Мінула больш месяца з таго часу, калі Мазырская, міжраённая нарада саветаў зьвярнулася з адозвай да ўсіх сельсаветаў БССР аб арганізацыі ўсебеларускага спаборніцтва за перабудову работы саветаў, за стварэньне «Чырвонай кнігі». За гэты час вялікая мноства сельсаветаў і іншых арганізацый уключыліся ў гэтае сацыялістычнае спаборніцтва і ўзялі канкрэтныя абавязацельствы змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за выкананьне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Чырвонаштандарнае настаўніцтва ніколі не стаяла ў баку ад важнейшых гаспаларча-палітычных кампаній і ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва. Асьветнікі БССР актыўна дапамагаюць партыі і ўраду ператвараць нашу краіну ў перадавую індустрыяльна-калгасную, у краіну суцэльнай пісьменнасьці.

30 тысячная армія работнікаў асьветы БССР уключаецца ў сацыялістычнае спаборніцтва за перабудову работы саветаў і стварэньне «Чырвонай кнігі сацыялістычных рапартоў саветаў», арганізаваную газэтай «Савецкая Беларусь».

Чырвонаштандарныя асьветнікі бяруць на сябе канкрэтныя абавязацельствы ў дадатак да той праграмы-мінімуму, якая выпрацавана для саветаў. Асьветнікі БССР абавязваюцца:

1. Усямерна дапамагчы рабоце сэкцый культбудаўніцтва пры саветах. Стварыць гэтыя сэкцыі там, дзе іх няма, стварыць сталыя брыгады ў буйных сэкцыях гарадзкіх саветаў і паасобных сельскіх саветах.

2. Садзейнічаць таму, каб усе саветы БССР, якія знаходзяцца па-за спаборніцтвам, уключыліся-б у спаборніцтва за стварэньне «Чырвонай кнігі».

3. Прыняць самы актыўны ўдзел у рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і далейшым пашырэньні калгаснага руху.

4. Сумесна з саветамі змагацца за рэалізацыю пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе, за палітэхнізацыю школы і правядзеньне ўсеагульнага навучаньня.

5. Чырвонаштандарныя асьветнікі будуць рашуча і актыўна змагацца за ператварэньне БССР да 1 мая 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці. Настаўніцтва БССР бярэ на сябе абавязацельства палкам забясьпечыць інструктарскім і мэтадычным кіраўніцтвам справу ліквідацыі няпісьменнасьці.

ЦК саюзу заклікае працаўнікоў культурнага фронту шляхам шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, канкрэтнай справай дапамагчы саветам у іх барацьбе за генэральную лінію партыі, дапамагчы ім перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі 3 рашаючага году пяцігодкі, у барацьбе за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Чырвонаштандарныя асьветнікі! З яшчэ большым энтузіязмам будзем змагацца за завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі, за пабудову сацыялізму ў нашай краіне.

Прэзыдыум ЦП
саюзу працасьветы.

Чырвонаштандарнае настаўніцтва Віцебску актыўна дапамагае сацспаборніцтву саветаў

Пленум сэкцыі культурнага будаўніцтва Віцебскага гарсавету 16 лістапада пастанавіў уключыцца ў сацспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе».

Пленум прыняў у аснову праграму—мін

Першая канфэрэнцыя МенАПП'у адчынена

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пралетарская літаратура павінна стаць вялікім мастацтвам бальшавізму. Рабочыя ўдарнікі, закліканыя ў літаратуру—новы бальшавіцкі атрад змагароў за сацыялізм

Скромна, без асаблівай парадкасьці адкрылася першая канфэрэнцыя МенАПП'у. Дзелавы тон ад чуваўся з першых слоў т. Александровіча, адчыніўшага 25 лістапада ў клюбе Камасьветы першае пасяджаньне.

На чырвоным палотнішчы, якім быў абшытуты стол прэзыдыуму, напісаны лёканічны, кароткі сказ:

— За вялікае мастацтва бальшавізму!

Пад гэтым лёзунгам пройдзе першая канфэрэнцыя МенАПП'у. За выкананьне гэтага лёзунгу пралетарскай літаратуры будуць змагацца пралетарскія пісьменьнікі БССР.

Такой-жа лёканічнай мовай адкрываўся зьезд. Тав. Александровіч сказаў:

— Мы можам сёньня рапартаваць партыі і ўсёй рабочай клясе аб сваіх перамогах на літаратурным фронце. Мы пад яе непасрэдным кіраўніцтвам ідэёва загартоўваем пралетарскі атрад літаратуры, мы змагаемся за вялікае мастацтва бальшавізму.

І далей:

— ... Нанесен цяжкі руйнуючы ўдар наймітам польскай дэфанзывы—беларускім нацыянал-дэмакратам.

— ... Барацьба за партыйнасьць у літаратуры, барацьба з апартуністычнай расхлябанасьцю, змаганьне за ленінскі шлях ва ўсёй мастацкай творчасьці—наша задача...

Адначасова:

— ... Не асляблянць клясавай барацьбы на літаратурным фронце, змагацца з правымі вяліказяржаўнага шавінізму, з носьбітамі нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі.

Адначасова:

— ... Агонь на два фронты, на правых і «левых»... узбройвацца ленінізмам, узьняць творчую актыўнасьць, уключыцца ў ралы будаўнікоў сацыялізму—гэта шлях ліквідацыі адставаньня літаратуры.

— Японскія імпэрыялісты правакуюць нас на вайну. Крызіс капіталізму і палазі ў Манчжурыі напамінаюць нам аб небясьпецы новай імпэрыялістычнай вайны. Ваенная тэматыка, тэматыка абароназдольнасьці набывае вялікую актуальнасьць... гэты прарыў трэба ліквідаваць.

— Разгарнуць творчую дыскусію. Выявіць і выкрыць усё варожае мастацкай творчасьці, змагацца за марксыцка-ленінскую тэорыю ў літаратуры.

— Сёньня разам з намі ўсе пытаньні, якія стаяць перад пралетарскай літаратурай, будуць вырашаць новыя аўтары-ударнікі закліканьня ў літаратуру.

А ўдарнікі прызваныя ў літаратуру сёньня-ж з старонак свайго зборніка, выданага да першай канфэрэнцыі МенАПП'у гавораць так:

Навошта патрэбны
істэрычны крык?
Трэба, каб песьня,
шурхала да молата рукі,
Трэба, каб песьня
забівала ў рыштоўку цьвік.

Са старонак зборніка ад імя першых 16 ударнікаў, закліканых у літаратуру, гаворыць алзін з іх так:

І ніколі не закілзацца мне
у струны поэцікаў гітарных,
Іх арыі мімаволі
прыводзяць да тхлані
багэм

Рэвалюцыі пульсацыя,
запал брыгад ударных,
Гэта мой порах
для начынкі знаралаў—
паэм.

Вось чым адказвае першы атрад рабочых ударнікаў, закліканых у літаратуру.

Канфэрэнцыя склікана ў час клясавай барацьбы і сацыялістычнага росту. Усе залачы, якія стаяць перад пралетарскай літаратурай, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі павінны быць выкананы з посьпехам.

Першая канфэрэнцыя МенАПП'у адчынена.

У гэты-ж вечар канфэрэнцыя слухала даклад сакратара ЦК КП(б)Б т. Шаранговіча—чацьверты год пяцігодкі і задачы пралетарскай літаратуры.

Б—ў.

Да пытаньня аб пашырэньні правоў гарсаветаў, падпарадкаваных РВК

Праводзімая зараз работа ЦКК-НК РСІ БССР пры ўдзеле ЦВК, газэт «Савецкая Беларусь» і «Чырвоная Зьмена» па распрацоўцы мерапрыемстваў аб пашырэньні правоў гарсаветаў, пад парадкаваных РВК, і па ўзмацненьні іх матар'яльна-фінансавай базы, набывае зараз асабліва важное значэньне. Гарсаветы, асабліва падпарадкаваныя РВК, яшчэ як належыць не перабудаваны валі сваю работу прыстасавальна да новых залач, што стаяць перад партыяй у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі гаспадаркі і павароту ўсёй работы савету тварам да вытворчасьці, да калгаснага будаўніцтва.

Чэрвенскі пленум ЦК УсеКП(б) па пытаньні гаралзкой камунальнай гаспадаркі адзначыў, што гарсавет павінен стаць «гаспадаром адказваючым за ўсе галіны гаспадаркі».

Савет у цэлым, усе яго сэкцыі і кожны дэпутат у паасобку, павінен адказваць перад сваімі выбаршчыкамі за кожны недахоп, выяўлены ў работе савету, за становішча ўсёй гарадзкой і камунальнай гаспадаркі.

Трэба з усёй строгасьцю ўтарыць па тых РВК, якія ў сваёй работе імкнуцца на непатрабнага апякунства і захопу функцый гарсавету, падрыву яго матар'яльна-фінансавай базы, мэханічнага вынятьня сроткаў кае гарсавету, захаваньня за сабой больш ва холных крыніц. Нельга дапушчаць зьвядзеньня работы гарсавету да простага разьмеркаваньня кватэр.

Трэба ўдасканаліць сыстэму кіраўніцтва і разьмеркаваньня адміністрацыйна-гаспадарчых правоў паміж РВК і гарсаветамі па ўсіх галінах работы: агульнае кіраўніцтва фінансага палатковай работай, каапэрацыйнай, гаспадарча-эканамічнай і прамысловай, камунальнай гаспадаркі, аховы працы, культурка-асьветнай і інш. Патрэбна праверыць наколькі прышчапляюцца новыя сацыялістычныя формы і мэтады работы гарсавету, саспадарніцтва і ўдарніцтва, грамадзкі буксір, грамадзкія інспэктары, сыстэма захвочваючых форм аплаты працы, сацыялістычнае сумяшчаньне. Як праходзіць упягненьне працоўных мас у кіраўніцтва дзяржавай.

Гэту работу можна выканаць толькі пры ўмове максымальнай мабілізацыі вакол яе савецкай грамадзкасьці і ў першую чаргу саміх гаралзкіх саветаў, сэкцый, дэпутацкіх груп, партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый, рабселькораў і шырокім асьвятленьні яе прахаджэньня як у раённым, так і пэнтральным друку з мэтай абмену дэпшым вопытам работы гаралзкіх, пасялковых і местачковых саветаў.

А. У.

Пра меры барацьбы з лятунствам, перацягваньнем і парушэньнем працоўнай дысцыпліны

Пастанова Народнага Камісарыяту Працы БССР, НК РСІ і ЦСПСБ

За апошні час наглядаецца шэраг выпадкаў самавольнага пакіданьня работы асобнымі работнікамі і ў асаблівасьці спэцыялістамі і пераход іх на іншыя работы без згоды кіраўніцтва прадпрыемства, ці ўстановы А таксама выпадкі перацягваньня работнікаў паасобнымі гаспадарчымі і савецкімі органамі.

Такое становішча ня толькі перашкаджае плянаваму забясьпечэньню народнае гаспадаркі кадрамі, але-ж дэзарганізуе вытворчасьць, парушае працоўную дысцыпліну і зрывае работу асобных прадпрыемстваў і ўстаноў.

Прызнаючы такое становішча недапушчальным, Наркампрацы БССР сумесна з НК РСІ і ЦСПСБ пастанаўляе:

1 Растлумачыць усім гаспадарчым, савецкім і інш. прадпрыемствам і ўстановам, што пастанова ЦВК і СНК СССР ад 13-IX-31 г. зьмеш. у газ. «Известия» ЦИК СССР за 19-IX-31 г., якая дазваляе непасрэдна наём рабочае сілы і спэцыялістаў без звароту ў органы працы, ні ў якім разе не дае падстаў для перацягваньня работнікаў, ці для самавольнага пакіданьня работ.

2. Прапанаваць органам працы ўзмацніць меры барацьбы з перацягваньнем, лятунствам і да т. п. зьявішчамі дэзарганізуючых работу прадпрыемстваў і ўстаноў.

3. Папярэдзіць усе гаспадарчыя арганізацыі і ўстановы, што пастановай СНК БССР за 4-XII-30 г. (зьмешч. у газ «Савецкая Беларусь» за 6-XII-30 году) забаронена прымаць на работу без органаў працы асоб, якія кінулі работу па сваёй волі, альбо зволены з работы за парушэньня правіл унутранага парадку.

4. Прапанаваць Рай. і Гар КК РСІ аказаць дапамогу органам працы ў барацьбе з вышэйпаказанымі зьявішчамі, прыцягваючы асобных крайнікоў устаноў і прадпрыемстваў за перацягваньне, і прыём на работу асоб самавольна пакінуўшых працу, альбо зволеных за парушэньне ўнутранага парадку, да адпаведнай адказнасьці.

5. Прафсаюзным арганізацыям павесьці рашучую барацьбу з самавольным застаўленьнем працы, перацягваньнем работнікаў, парушэньнем правіл унутранага парадку, якія дэзарганізуюць вытворчасьць, парушаюць працдысцыпліну і перашкаджаюць плянаваму забясьпечаньню народнае гаспадарк кадрамі.

Нам. Наркампрацы БССР Пушчын.
Нам. Наркома НК РСІ Гурэвіч.
Старшыня ЦСПСБ Рыжоў.

18 лістапада 1931 г.
№ 50. гор. Менск.

Палажэньне

пра Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі БССР

1. Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі БССР ажыцьцяўляе ў межах, устаноўленых законамі СССР і БССР, плянава-тэхніка-эканамічнае кіраваньне падпарадкаванаю яму рэспубліканскаю прамысловасьцю, а таксама адпаведнаю мясцоваю прамысловасьцю, прамысловасьцю прамысловай каапэрацыі і падпарадкаванымі яму снабжаючымі органамі.

2. На ВСНГ БССР ускладаецца:

а) распрацоўка і ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па індустрыялізацыі і электрыфікацыі прамысловасьці БССР, у павсобку распрацоўка пытаньняў новых галін прамысловасьці, новых вытворчасьцей і промыслаў,

б) распрацоўка асноўных лімітаў разьвіцьця прамысловасьці і ўзгадненьне плянаў разьвіцьця рэспубліканскай, мясцовай і наркамацкай прамысловасьці і прамысловасьці прамысловай каапэрацыі;

в) зацьверджаньне вытворча-фінансавых плянаў, плянаў капітальнага будаўніцтва і рэканструкцыі ў адпаведнасьці з устаноўленымі лімітамі, балянсаў і справаздач па рэспубліканскай прамысловасьці і прамысловасьці прамысловай каапэрацыі, плянаў капітальнага будаўніцтва і рэканструкцыі, а таксама справаздач мясцовай прамысловасьці;

г) падача на зацьверджаньне Ураду БССР і ВСНГ СССР зводкі кантрольных лічбаў, плянаў новага капітальнага будаўніцтва і рэканструкцыі існуючых прадпрыемстваў па рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці;

д) кантроль за выкананьнем вытворча-фінансавых плянаў і плянаў капітальнага будаўніцтва па рэспубліканскай, мясцовай прамысловасьці і прамысловасьці прамысловай каапэрацыі;

е) разгляд і зацьверджаньне праз Белэнэрга прамзаданьняў і тэхнічных праектаў па электрабудаўніцтву ўсіх сэктароў народнай гаспадаркі БССР і па ўсёй энэргетычнай гаспадарцы ўсіх сэктароў народнай гаспадаркі ў межах устаноўленых законам лімітаў і выдачы дазволаў на электрабудаўніцтва;

ж) складаньне кан'юнктурных аблядаў прамысловасьці БССР;

з) складаньне агульных плянаў снабжэньня апалам і спажываньня апалу і кантроль за яго расходваньнем па прамысловасьці, якая плянуецца і рэгулюецца ВСНГ; распрацоўка мерапрыемстваў для ўкараненьня мясцовых відаў апалу;

і) арганізацыя дапамогі рабочаму вынаходніцтву;

к) рацыяналізацыя сыстэмы кіраваньня прамысловасьцю, укараненьне гаспадарчага разьлікучку, арганізацыя рацыяналізацыі вытворчасьці, энэргагаспадаркі і скарыстаньня апалу.

л) распрацоўка мерапрыемстваў па снабжэньні прамысловасьці завозным і мясцовым сыравінаю, падрыхтоўка сыравінай і энэргетычнай базы;

м) складаньне зводных плянаў патрэбнасьці будаўнічых матар'ялаў па рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці і апрацыйчае іх разьмеркаваньне паміж прадпрыемствамі прамысловасьці, якая плянуецца і рэгулюецца ВСНГ;

н) распрацоўка пытаньняў фінансаваньня і крэдытаваньня прамысловасьці і распаразьдзяленьне грашовымі і крэдытнымі рэсурсамі ў адпаведнасьці з зацьверджанымі плянамі і кантрольнымі лічбамі;

о) устанаўленьне і рэгуляваньне цэн на вырабы прамысловасьці;

п) вярбоўка рабочай сілы для рэспубліканскай прамысловасьці;

р) распрацоўка і ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і разьмеркаваньні адміністрацыйна-тэхнічных, і рабочых кадраў для прамысловасьці; арганізацыя вышэйшых тэхнічных школ, навукова-дасьледчых устаноў, тэхнікумаў, прафтэхнічных школ, школ фабрычна-заводзкага навучэньства, усялякіх курсаў, у адпаведнасьці з зацьверджанымі плянамі, і кіраваньне імі, а таксама праходжаньнем практык студэнтамі і стажорамі на прадпрыемствах;

с) распрацоўка мерапрыемстваў па эканомцы працы (навуковая арганізацыя працы, палітыка-заработнай платы, тэхнічнае нармаваньне, сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва і інш. формы сацыялістычнай арганізацыі працы і г. д.);

т) арганізацыя і кіраваньне горнадасьледчаю працаю праз Беларускі Геалега-разьведачны трэст («Белгеалегаразьведка») і нагляд за ажыцьцяўленьнем горнага законадаўства;

у) распрацоўка пытаньняў падліку, справаздачнасьці і статыстыкі ў прамысловасьці, і інструктаж аб'яднаньняў, трэстаў і камбінатаў па гэтых пытаньнях;

ф) ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў для разьвіцьця прамысловай каапэрацыі, разгляд вытворча-фінансавых плянаў Беларускага Саюзу прамысловай каапэрацыі і аб'яднаньняў Беларускай інвалідная каапэрацыі для ўзгадненьня іх з вытворча-фінансавымі плянамі дзяржаўнай прамысловасьці;

х) назначэньне і зьзальненьне кіруючага складу прамысловасьці;

ц) арганізацыя аб'яднаньняў і трэстаў і зацьверджаньне іх статутаў;

ч) заключэньне дагавораў і зьдзелак, якія зьвязаны з выкананьнем абавязкаў ускладзеных на ВСНГ БССР.

3. У дачыненьні да падпарадкаванага ВСНГ Саюзу ССР прадпрыемстваў агульнасаюзнага значэньня на ВСНГ БССР ускладаецца нагляд за выкананьнем імі прамфінплянаў і дырэктыў Ураду БССР і ВСНГ СССР, выслухоўваньне на пасяджэньнях Прэзыдыуму ВСНГ БССР справаздач аб іх дзейнасьці і дача заключэньняў ВСНГ СССР па прамфінплянах і пэрспэктыўных плянах гэтых прадпрыемстваў.

4. На чале ВСНГ БССР стаіць старшыня і яго намесьнікі.

5 ВСНГ БССР складаецца з Пленуму і Прэзыдыуму, якія назначаюцца Саветам Народных Камісараў БССР.

6 У склад ВСНГ БССР уваходзяць:

а) сэктар праверкі выкананьня;

б) сэктар плянаваньня, у які ўваходзіць таксама і група фінансаваньня;

в) сэктар капітальнага будаўніцтва;

г) сэктар снабжэньня, у які ўваходзіць таксама і транспартная група;

д) сэктар эканомікі працы;

е) сэктар статыстыкі і справаздачнасьці;

ж) сэктар кадраў;

з) сэктар рацыяналізацыі;

і) сэктар апалу;

к) сэктар прамислова-каапэрацыйнай і наркамацкай прамысловасьці;

л) горны нагляд;

м) кіраўніцтва спраў;

н) сэктар спэцыяльны.

7. Апэрацыйнае кіраваньне паасобнымі галінамі прамысловасьці ВСНГ БССР ажыцьцяўляе праз галінныя аб'яднаньні, якія зьяўляюцца органамі ВСНГ БССР.

8 Пры ВСНГ БССР знаходзіцца Навукова-дасьледчы Інстытут Прамысловасьці і Кіраўніцтва мясцовай прамысловасьцю.

9 Функцыі паміж паасобнымі часткамі ВСНГ разьмяркоўваюцца Старшынёю ВСНГ БССР

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.
В. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
Б. Вансоўскі.

15 кастрычніка, 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зацьвярджэньне палажэньня пра Вышэйшы Савет Народнае Гаспадаркі БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Зацьвердзіць палажэньне пра Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі БССР у новай рэдакцыі:

2. Скасаваць палажэньне пра ВСНГ БССР, зацьверджанае ЦВК і СНК БССР 23 лютага 1929 г. (З. З. БССР, 1929 г. № 9. паст. 45; 1930 г., № 37, паст. 244).

3. У пастанове СНК БССР за 24 сту дзеня 1930 г. «Пра рэарганізацыю кіраваньня прамысловасьцю БССР» (З. З БССР 1930 г., № 13, паст. 95) зрабіць наступныя зьмены:

а) скасаваць апошні абзац артыкулу 2 пачынаючы з слоў «Усе паказаньня вышэй функцыі і г. д.»;

б) п. «в» арт. 14 запісаць у наступнай рэдакцыі: «Аб'яднаньне паліграфічнай прамысловасьці ў складзе адпаведных прадпрыемстваў Палесдруку, Белдзяржвыдавецтва і мясцовай прамысловасьці»;

з) п. «д» арт. 14 запісаць у наступнай рэдакцыі: «Аб'яднаньне запалкавай і дапаможнай дрэваапрацоўчай прамысловасьці ў складзе адпаведных прадпрыемстваў б. Лесааб'яднаньня»;

г) п .п. «е» і «к» арт. 14 скасаваць.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.
В. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
Б. Вансоўскі.

15 кастрычніка, 1931 г.
гор. Менск.

Беларуская Акадэмія Навук разгортвае масавую працу

Рабочыя і калгасьніцкія масы патрабуюць ад усіх навукова-дасьледчых устаноў і навуковых працаўнікоў дапамагчы ім весьці сацыялістычную гаспадарку і працаваць па новаму.

«Ваш абавязак»—заяўляе пленум Грычанскага сельсавету Ш Усебеларускаму зьезду навуковых працаўнікоў—дапамагчы калгасьнікам хутчэй навучыцца весьці новую буйную калектыўную гаспадарку, назучыць нас, як практычна трэба змагацца за ўзьняцьце ўраджайнасьці, за высокія якасныя паказчыкі ў сацыялістычнай гаспадарцы».

Дапамагчы рабочым і калгасьнікам у справе тэхнічнага ўзбраеньня, у справе аўладаньня навукай для арганізацыі працы па новаму, для падняцьця вытворчасьці працы і найлепшага вядзеньня буйнай сацыялістычнай гаспадаркі—задача ўсіх навукова-дасьледчых устаноў. Але ў гэтай працы павінна быць плянавасьць. Тое саматужніцтва і той разнабой у масавай рабоце навукова-дасьледчых устаноў, якія меліся да гэтага часу, павінны быць ліквідаваны.

У Беларускай Акадэміі Навук арганізаваны сэктар масавай работы, задачай якога і зьяўляецца шырокая прапаганда тэхнікі, арганізацыя масавай навукова-дасьледчай працы і яе прыстасаваньне ў розных галінах сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама і плянаваньне ўсёй гэтай працы ў БССР.

Сэктарам масавай работы ўжо разгорнута і праведзена вялікая праца. Праведзена нарада кіраўнікоў навукова-дасьледчых і гаспадарчых устаноў па пытаньнях разгортваньня тэхнічнай прапаганды і масавай навукова-дасьледчай працы, выданьня адпаведнай папулярнай літаратуры і плянаваньня працы. Падрыхтаваны і зданы ў друк матар'ял па вывучэньні гісторыі заводаў і «Гісторыі грамадзянскай вайны», падрыхтоўваюцца праграмы і інструкцыі па арганізацыі масавай дасьледчай працы на заводах, у калгасах і саўгасах, у школах. У сьнежні месяцы будзе праведзена шырокая канфэрэнцыя з удзелам гаспадарчых і плянуючых устаноў і арганізацый, рабочых, калгасьнікаў, камсамольскіх, прафэсійных, краязнаўчых і інш. арганізацый. Канфэрэнцыя павінна будзе вырашыць рад практычных пытаньняў па арганізацыі і разгортваньні масавай навукова-дасьледчай (краязнаўчай) працы на прадпрыемствах, саўгасах, калгасах, школах. Канфэрэнцыя павінна будзе зрабіць рашучы пералом ў адносінах раду навукова-дасьледчых устаноў, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый да масавай дасьледчай працы, якая яшчэ недаацэньваецца, як некаторымі пэнтральнымі, так і мясцовымі ўстановамі і арганізацыямі. Пытаньнем краязнаўчай працы мала цікавяцца на ват такія ўстановы, як НКЗ, Калгасцэнтр, ВСНГ.

Зусім недапушчальным зьяўляецца абсалютнае ігнараваньне краязнаўчым рухам з боку гарадзкой і раённай інспэктуры. Так, напрыклад, Чаўскі інспэктар ня толькі не дапамагае разьвіцьцю масавай дасьледчай працы, але нават просіць і матар'ялаў не дасылаць. Такім апартуністычным адносінам да справы ўкараненьня і пашырэньня масавай дасьледчай працы на прадпрыемствах, у калгасах і школах не павінна быць месца. Канфэрэнцыя павінна будзе вырашыць і намеціць шляхі і мэтады пашырэньня масавага краязнаўчага руху.

Карэнны пералом да масавай працы павінен быць зроблен і з боку цэнтральных навукова-дасьледчых устаноў У першую чаргу тут патрэбна дабіцца плянавасьці і неадкладнага ўзгадненьня сваёй працы з масавым сэктарам БАН. Навукова-дасьледчыя інстытуты, дасьледчыя станцыі і г. д. павінны дапамагчы масаваму сэктару і ЦБК і прыняць актыўны ўдзел у складаньні праграм і інструкцый па розных галінах масавай дасьледчай працы, арыентуючыся на масавага дасьледчыка.

У сваім выдавецкім пляне масавы сэктар намеціў выданьне раду масавай папулярнай тэхнічнай літаратуры і ўзьнімае пытаньне аб выданьні спэцыяльнага часопісу для папулярызацыі навейшых дасягненьняў навукі і тэхнікі.

В. Самцэвіч.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Інстытут масавага заочнага навучаньня пры ЦК КП(б)Б

Расклад радыё-лекцый задач на сьнежань месяц 1931 г.

ЗАВОЧНА-КАМУНІСТЫЧНЫ УНІВЭРСЫТЭТ

1.XII. І. Курс гісторыі міжнароднага рэвалюцыйнага руху Лекцыя «Ленін аб ролі пралетарыяту ў буржуазных рэвалюцыях на Захадзе».

2.XII. І. Мэтодыка самастойнай працы: «Як карыстацца заданьнем».

16.XII. І. Бягучая палітыка «Абвастрэньні імпэрыялістычных супярэчнасьцяй і захоп Манчжурыі Японіяй».

21.XII. І. Курс палітэканомі (кансультацыя па 2 заданьню).

26 XII. І. Курс гісторыі міжнароднага рэвалюцыйнага руху (уводная лекцыя да другога заданьня) «Рабочы рух у першай палове XIX ст.

ЗАВОЧНА-КАМСАМОЛЬСКІ УНІВЭРСЫТЭТ, ЗАВОЧНАЯ СПШ.

2.XII. І. Курс гісторыі міжнароднага рэвалюцыйнага руху (кансультацыя па першым заданьні «Аб ролі пралетарыята і сялянства ў эпоху буржуазнай рэвалюцыі на Захадзе»)

12.XII. І. Бягучая палітыка «Абвастрэньні імпэрыялістычных супярэчнасьцяй у Кітаі і захоп Манчжурыі Японіяй».

17.XII. І. Мэтодыка самастойнай працы «Як карыстацца заданьнем».

22.XII. І. Курс палітэканомі: «Задача курса палітэканомі».

27 XII. І. Курс прыродазнаўства «Зямля як плянэта і пабудова зямлі».

ЭПІЗОДЫЧНЫЯ ЛЕКЦЫІ

4.XII. І. Вынікі лістападаўскага пленуму ЦК і ЦККК КП(б)Б.

9.XII. І. Задачы транспарту ў асеньня-зімовых перавозках

14.XII. І. Рабочае харчаваньне. Задачы дзяржаўнага гандлю і каапэрацыі.

19.XII. І. Барацьба міжнароднага пролетарыяту і рэвалюцыйнага сялянства за рэвалюцыйны выхад з крызісу

29.XII. І. Чарговыя задачы марксыцка-ленінскага выхаваньня.

6.XII. І. Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

7.XII. І Разьвіцьцё жывёлагадоўлі.

ЦЫКЛЯВЫЯ ЛЕКЦЫІ ДЛЯ РАДЫЁКУРСАЎ ПАРТАКТЫВУ

А. Па Камінтэрну

5.XII. Міжнародны рабочы рух перад вайной і крах II інтэрнацыяналу.

15.XII. Сусьветная вайна. Кастрычніцкая рэвалюцыя і нараджэньне III Інтэрнацыяналу.

25.XII Ленінізм і эпоха сусьветных войн і рэвалюцый.

Б. Па партбудаўніцтву.

10-га, 20-га і 30-га Чарговыя задачы партбудаўніцтва ў сувязі з перавыбарамі парторганаў

Увага: Цыклявыя лекцыі па Камінтэрну і партбудаўніцтву раяцца для шырокага партактыву.

Лекцыі перадаюцца праз радыёстанцыю імя саўнаркома БССР З 17 па 18 гадз. 30 кв.

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б ў другі раз выклікае тт Хіслаўскага З., Шэманюк Н., Зеленько С., Клісінскага А Сіняўскага В., Мілешко Т., Краўчук С., Малінoўскага А., Лісіца Н., Хлопцова Д. для пасылкі ў раёны У выпадку няяўкі ў трохдзённы тэрмін справа будзе перадана ў ЦККК КП(б)Б Прапануецца сакратарам партячэек, дзе працуюць памянёныя таварышы, аслабаніць іх ад працы і зьняць з вучоту.

Бюро сэкцыі Асьветы, якое адбудзецца 28 лістапада а 5 гадзіне ўвечары ў доме Асьветы (Камуністычная 19) выклікае наступных таварышоў, якія ня прымаюць удзелу ў працы Гарсавету: т.т. Івашчанка Е. У (ф-ка Крупскай) а 5 г. Гаўрыленка П Н (саюз Працмастацтва) а 5 г. Гаўрылаў А. В. (6 стр полк) 5 г. Зарамбоўскі К П (ЦП Саюзу Працасьветы) 5—10, Арлоў Я. С (ПП АПУ БССР) 5 г. 10., Касоўскі Х Б (Абуткоая ф-ка) 5 г. 10., Клімковіч М. М. (ЦСПСБ) 5 г. 20., Кузьняцоў А Я (6 стр. полк) 5 г 20., Перская З. А (ЦПП) 5 г 30, Навапруцкая Х. М (Дзіцячы сад № 31) 5 г. 30 Перэльмэн А Ц (Арцель Пралетары) 5 г. 30., Рашэр Г. О (м-к. хатніх работ № 2) 5 г. 40., Страхаў Р. І (5 канв. полк) 5 г. 40. Якаўлеў К М (3-я кав полк) 5 г. 40. Левін А М. (Рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь») 5 г. 50, Горын (БАН) 5 г. 50.

Адказны рэдактар П ШАСТАКОЎ

ІНДУСКАЯ ЗОРКА
Пачатак о 6, 8-20, 10-30 часа дня
Гукавы фільм
Златыя горы
у 8 частках

КІНО-ТЭАТ КУЛЬТУРА
Пач. а 7, 8-45 10-30, часа дня 5 г
Кінакамедыя
Свой хлопец
Звыш праграмы
Шахматная арачна і Хроніка № 21

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
Пач. 3-30, 6, 8-30, 9 і 10-30 часа дня 12 г
КАМЭДЫЯ
Шчасьлівыя вольцы
Звыш праграмы
Нарыс Саюзкіно № 6

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
Пачатак о 7 гадз
Пагашон у карціне
Знатныя падарожнікі
Звыш праг. Хроніка

Хатаўняннскаму бровару
ПАТРАБУЕЦЦА
ВОПЫТНЫ ШОФЭР
са стажам
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ
будуць адвесны камунальныя паслугі.
Жадаючыя прошм з явіцца асабіста, або пісьмова заявіць па адрасе Жу... ...чы Хатаўняннскаму бровару завода раўнаму.
Гаспадар раўніцтва

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
НА ЗАВОЧНЫ СЭКТАР Усебеларускага Дзяржаўнага Палітэхніка-Асьветнага Тэхнікуму
ПРАЦЯГВАЕЦЦА да 1 студзеня 1932 г.
Заявы накіроўваць у Магілеў, Камсамольская, 28.
Дырэктар Тэхнікуму КАПАЕВІЧ.

Барысаўскае Міжраённае Аддзяленьне
БЕЛСЕЛЬГАССНАБЖЭНЬНЯ
АБВЯШЧАЕ, што з 20 лістапада 1931 г.
АДЧЫНІЛА СВАЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ
па снабжэньні сельскай гаспадаркі сельска-гаспадарчым машынамі і іншымі сродкамі сельска-гаспадарчай вытвор ...сьці
Барысаўскага, Бягомльскага, Плешчаніцкага, Крупскага і Бярэзінскага раёнаў
АДРАС канторы і складу аддзяленьня: Нова-Барысаў, вуліца Гаранскага пераезд (Чыгуначны пераезд).
БЯГУЧЫ РАХУНАК: у Барысаўскім Аддзяленьні Дзяржбанку № 67-103
Для тэлеграм: Нова-Барысаў, Белсельгаснабжэньне.
Заг. Барысаўскага Райза СКАКУН
Заг. Канторы Барысаўскага Міжраённага Аддзяленьня Белсельгаснабжэньня ЛІЎШЫЦ.

ФОТОАПАРАТ—НА СЛУЖУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ БУДАЎНІЦТВУ
Кіраўніцтва ашчадкасамі і ДК БССР даводзіць да ведама
усіх працоўных, што ашчадкасамі БССР выдаваецца
РЭАЛІЗАЦЫЯ ФОТОАБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ,
па якіх трымальнікі апошняга змогуць атрымаць фотоапараты тыпу „Фотокор" № 1 разьмерам 9×12
з адпаведнымі прыладамі
КОШТ фотоабавязацельстваў 1, 2, 3 серыі 220 руб., 4, 5, 6 і 7—187 рублёў.
КОШТ фотоабавязацельства аплачваецца ў растэрміновку да 1-XII 1933 г.
У ЗАЛЕЖНАСЬЦІ АД СЭРЫІ.
Выдача фотоапаратаў пачынаецца з 1-VII 1932 г. Фотоабавязацельствы будуць рэалізаваны да 1 кастрычніка 1933 г.
Кіраўніцтва ашчадкасамі і ДК БССР.

Менгарком КП(б)Б і рэдакцыя газ. „Савецкая Беларусь"
1-га сьнежня г. г., а 7 й адзінаццатай вечары ў клюбе Белкаапсаюзу (Савецкая, 43)
СКЛІКАЮЦЬ ЗЬЛЁТ
рэдакцый нарматыўных газэт, ...коораў, сэкратароў ячэек КП(б)Б, ...ыў комаў, ...ораў на тупных орг...ізацый ...
1. Пер...
2. Аб конкурсе ...
Явка ...
Менгарком КП(б)Б, рэдакцыя газ. „Савецкая Беларусь"

Беларускі Рэспубліканскі Інстытут
завочнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі с.-г. кадраў пры НКЗ
і МАЛАДЗЕЖНЫ ІНСТЫТУТ ЦК ЛКСМБ
абвяшчаюць, што пры с.-г. ВНУ і тэхнікумах БССР
АДЧЫНЕНЫ ЗАВОЧНЫЯ СЭКТАРЫ,
якія праводзяць падрыхтоўку, перападрыхтоўку с.-г. кадраў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі і майстраў-брыгадзіраў.
Спіс завочных сэктароў і спэцыяльнасьцяй, умовы прыёму, форма анкеты—заявы, навучальныя планы, мэтады навучаньня і інш., надру...ваны ў аспэкце Рэспубліканскага Інстытуту, які пасылае ...ва ўсе райземчаст... і інш. раённыя арганізацыі БССР, саўгасы, калгасы, МТС.
Праспэкт і даведкі можна атрымаць у Рэспубліканскім Інстытуце—Менск, Савецкая, 71.
Дырэктар Рэспубліканскага Інстытуту ШУМЕЙКА

Цэнтральнае Архіўнае Кіраўніцтва БССР
ПЕРАЕХАЛА
на вул. Бакуніна, д. 4
(у памяшканьне Менскага Гістарычнага Архіву)
ЦЭНТРААРХІЎ.

ЗГУБЛЕНЫ:

Даведка аб сканчэньні 7-мі годні выданая Хоцімскай школай на імя Цыкаціна, кв. 1120-п.

Вайсковы білет выд. Хоцімскім РВК на імя Макарэнкі В., кв. 1120-п.

Вайсковы білет выд. на імя Дземкіна Хоцімскім РВК, кв. 1120-п.

Вайсковы білет выд. Хоцімскім РВК на імя Памасенкі М., кв. 1120-п.

Паляўчы білет № 200 выд Хоцімскім Ахотсаюзам на імя Марчанкі І., кв. 1120-п.

Партбілет № 0813439 выд. Магілеўскім Акр. КПБ на імя Тарасевіча А., кв. 1120-п.

Членскі білет Нарасьветы выданы Мсьціслаўскім мясцкомам на імя Тарасевіча, кв. 1120-п.

Квіток на ўнесены аванс на паліто на суму 75 руб. на імя Тарасевіча, кв. 1120-п.

Прыпісная кніжка запрызыўніка выданая Хоцімскім РВК на імя Нікірэтова Цімафея, кв. 1120-п.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—4-78, сэкцыяў—3-15 Выдавецтва—22-44. Выпускаючага 12-65 (два званка
Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., і год—12 руб. Выхадныя дні 5, 10, 15, 20, 25, 30.)

Упаўнаваж. Галоўлітбела № А—2521.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.